ЭКАНАМІЧНАЕ ЛІДАРСТВА СТАЛІЦЫ 3





ПЫТАННІ КАЛЯДНЫХ ЧЫТАННЯЎ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 СНЕЖНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 235 (30369)

З першых вуснаў

# «ТРЭБА ВЫЗНАЧЫЦЬ ФРОНТ РАБОТЫ»

## Падрабязнасці кадравага дня ў Прэзідэнта

**Новы рабочы тыдзень пачаўся з новых прызначэнняў. У графіку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі — кадравы дзень. Новыя кіраўнікі з'явіліся ў дзяржаўных органах кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органах, дзяржаўных арганізацыях.**



Фота БелТА.

### З УСІХ МАСТАЦТВАЎ НАЙВАЖНЕЙШАЕ ДЛЯ НАС — КІНО

Руслан Чарнецкі, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы, прызначаны на пасаду міністра культуры. «Калі не найважнейшае, то вельмі знакавае назначэнне», — заўважыў Прэзідэнт. Звяртаючыся да новага міністра культуры, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што нашу культуру той адчуў добра, ён яе прайшоў: і канцэртную, і кіношную дзейнасць новы міністр ведае. «Адзінае пытанне — ці зможаце вы гэтым усім кіраваць. Мы, канешне, будзем рабіць усё, каб у вас быў чалавек, на якога вы маглі б разлічваць і які гэтым у жыцці ўжо займаўся. Але самае цяжкае ў гэтай працы, як я разумею за ўсе свае гады (мне з культурнымі работнікамі прыйшлося сутыкацца неаднойчы), тое, што гэта настолькі розныя людзі, настолькі таленавітыя, здольныя і вельмі амбіцыйныя. Мусіць, вам таксама гэта блізка і вы разберацеся з гэтым. Я заўсёды шкадую міністра культуры ў тым плане, што даводзіцца такі націск вытрымліваць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Ён прызнаўся, што на пачатку сваёй прэзідэнцкай дзейнасці ўнікаў ва ўсе праблемы кожнага культурнага работніка, стараўся разабрацца. «Потым я зразумеў, што калі буду займацца толькі праблемамі гэтых людзей, дык на ўсё астатняе ў мяне не хопіць часу. Ды і бачу: зробіш добра, усе задаволеныя, а назаўтра нейкі гурт заўзята выступае супраць таго, што ты зрабіў, і кажа, што гэта ўсё няправільна і не трэба было ім дапамагаць і яшчэ нешта. Увогуле, мітусня была прыстойная. І тады я зразумеў, што гэтае асяроддзе занадта канкурэнтнае. І я бачу гэта па Расіі, там вельмі жорсткая канкурэнцыя. Але трэба канкурыраваць: хто больш таленавіты, той і наверсе, хто не зможа гэту канкурэнцыю вытрымліваць — ну што ж, ён сам сабе абраў гэту дарогу. Хаця не скажу, што я не падтрымліваю імкненне людзей быць наверсе. Яны ўсе хочуць быць наверсе, навідавоку — такая ў іх работа», — сказаў Прэзідэнт. Таксама Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што з усіх мастацтваў для нас найважнейшым з'яўляецца кіно. І тое, што адбываецца ў нашым кінематографе, паводле яго слоў, — проста ганьба. «Гэта недапушчальна. Мы скаціліся. Мы горш сталі выглядаць да таго савецкага перыяду, калі мы ўдзялялі сур'ёзную ўвагу кінематографу. Не скажу, што тут мы ў гэтым не зацікаўлены, але чамусьці ўсе хочуць мець грошы, а на выхадзе не хочуць пагадзіцца з тым, што трэба мець добры фільм, карціну добрую. Звярніце на гэта самую сур'ёзную ўвагу», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

## КОРАТКА

- **МТЗ паставіць у Пакістан не менш як 2,7 тыс. трактароў BELARUS у 2025 годзе.**
- Па даных ЕАБР, рэальная заработная плата ў Беларусі павялічылася на 13 % у кастрычніку пасля 12,5 % у верасні 2024 года.
- **За мінулы тыдзень у Беларусь у бязвізавым парадку ўехалі 3374 грамадзяніны з 38 еўрапейскіх дзяржаў.**
- За месяц чарга фур у ЕС павялічылася ў чатыры разы.
- **Пяць новых самазвалаў серыі БЕЛАЗ-7513 грузападымальнасцю 136 т уведзены ў эксплуатацыю ў транспартным парку Айхальскага горна-абагачальнага камбіната, які здабывае алмазы ў Рэспубліцы Саха (Якуція).**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар КАРАНКЕВІЧ, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Мы пабудавалі ўласную атамную электрастанцыю, запусцілі ў космас уласныя спадарожнікі дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, далучыліся да касмічных даследаванняў на МКС, адправіўшы туды свайго касманаўта, пабудавалі ўласную станцыю ў Антарктыдзе. Узровень беларускіх спецыялістаў у галіне IT-тэхналогій і штучнага інтэлекту вядомы ва ўсім свеце і не мае патрэбы ў дадатковай рэкламе. Дзякуючы дальнабачнай палітыцы кіраўніка дзяржавы з яго вопытам гаспадарання «ад зямлі» і працавітасці беларусаў сёння мы не толькі самі сябе забяспечваем харчаваннем, але і ўвайшлі ў пяцёрку найбуйнейшых экспарцёраў у Еўропе».*

Спецыяльны рэпартаж

# ТЫСЯЧЫ СЭРЦАЎ ВА ЎНІСОН

**Рэспубліканская грамадска-культурная акцыя «Марафон адзінства» яркім канцэртам развіталася з жыхарамі і гасцямі фестывальнага Віцебска. Два дні ў горадзе на Дзвіне былі насычаны выставамі, карыснымі праектамі і інтэрактыўнымі пляцоўкамі, на якіх як ніколі панавала атмасфера адзінства беларускага народа.**

### Падзяка працаўнікам і эфектыўны фармат

Першы дзень «Марафону адзінства» зарадзіў віцябчан святочным настроем на ўсіх вуліцах і прадпрыемствах горада. Ужо вядомы беларускім рабочым праект «Разам працуем, разам спяваем!» 29 лістапада завітаў на Вітбудтэхмаш, Віцебскі футравы камбінат і ў лакаматыўнае дэпо Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі. Проста на працоўных месцах для людзей выступілі зоркі беларускай эстрады, са словамі падзякі звярнулася да сваіх работнікаў кіраўніцтва прадпрыемстваў.




СТАР. 4–5

Сацыяльны аспект

# МАГЧЫМАСЦІ НЕ АБМЕЖАВАНЫЯ

## Гэта даказвае І Рэспубліканская выстава-продаж вырабаў, створаных людзьмі з інваліднасцю

**Больш за 60 творчых людзей з інваліднасцю з розных рэгіёнаў нашай краіны аб'яднала выстава-продаж «Тварэнні сэрцаў», якая адкрылася напярэдадні Дня інвалідаў, у «Першым нацыянальным гандлёвым доме». Тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і сацыяльныя пансіянаты ўсіх абласцей Беларусі і Мінска да 1 снежня будуць прадстаўляць наведвальнікам аднаго з найбуйнейшых гандлёвых цэнтраў сталіцы работы самых таленавітых і крэатыўных людзей з сапраўды неабмежаванымі магчымасцямі.**

СТАР. 8–9



ISSN 1990 — 763X

24235>

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на І квартал і І паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «ТРЭБА ВЫЗНАЧЫЦЬ ФРОНТ РАБОТЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Канцэртная дзейнасць, паводле яго слоў, таксама важная для людзей. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што людзі хочуць не толькі працаваць дзень і ноч, але і нейкай весялосці. У прыклад ён прывёў «Марафон адзінства», у якім актыўна ўдзельнічае і Руслан Чарнецкі. Паводле слоў Прэзідэнта, гэты праект паказаў, што людзі адгукаюцца і разумеюць і танцавальнае мастацтва, і песеннае, і гэтак далей. «Гэтаму трэба ўдзяляць увагу, але гэта працей, мусіць, у нашай сітуацыі. Словам, комплекс сур'ёзных праблем», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама падкрэсліў, што міністрам культуры павінен быць чалавек са сферы культуры. «Вам гэта ўсё знаёма, вы чалавек патрыятычны. Надзейны чалавек. Я спадзяюся, што вы справіцеся з гэтай работай. Проста па-мужчынску хачу сказаць: у цябе, Руслан, іншага шляху няма — ці памерці, ці навесці парадак у гэтай сферы. А людзі ў нас таленавітыя. Яны могуць усё: кіно здымаць, спяваць і танцаваць, і іншае. Падтрымка вам будзе забяспечана ўсялякая», — канстатаваў Прэзідэнт.

## СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ ТРЭБА, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ПРАБЛЕМЫ

Станіслаў Чапурны прызначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Туркменістане. Да гэтага ён працаваў начальнікам галоўнага ўпраўлення міжнароднага супрацоўніцтва і гандлю Апарату Савета Міністраў. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, нам трэба супрацоўнічаць з Туркменістанам, як бы складана ні было, нягледзячы на праблемы. Прычым, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, праблемы і аб'ектыўнага, і суб'ектыўнага характару. «Але інтарэс заўсёды ў кіраўніцтва Туркменістана быў вельмі вялікі да Беларусі. Уся справа ў тым, што ў нас ёсць усё, што ім трэба. Але і ў нас ёсць сур'ёзныя інтарэсы да самога Туркменістана, паколькі яны вельмі зацікаўлены ў тым, што мы можам, асабліва ў тэхналогіях», — паставіў задачы новаму паслу кіраўнік дзяржавы.

## ТРЭБА ЗАНЯЦЦА ЗЯМНОЙ СПРАВАЙ

Былы міністр па падатках і зборах Сяргей Налівайка прызначаны на пасаду памочніка Прэзідэнта — інспектара па Магілёўскай вобласці. Як заўважыў Прэзідэнт, такое рашэнне было звязана з тым, што Сяргею Налівайку патрэбна больш актыўная работа. «Вы будзеце працаваць разам з Дзмітрыем Мікалаевічам (кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта і ўпаўнаважаны кіраўніка дзяржавы па Магілёўскай вобласці Дзмітрый Крутой. — «**Зв.**») як упаўнаважаныя асобы па Магілёўскай вобласці. Ён настойваў на вашай кандыдатуры, я, магчыма, бачыў вас у іншым плане. Але я згодны з тым, што вам трэба адарвацца ад гэтай цяжкай кабінетнай работы — такая служба ў міністра па падатках — і заняцца зямной справай. Думаю, для вашай будучыні гэта таксама будзе карысна. Пасада ўстаялася, вядома, чым займаецца памочнік, — гэта перш за ўсё кадры, вы за гэта з кіраўніком Адміністрацыі, упаўнаважаным па Магілёўскай вобласці, несяце адказнасць. Гэта не значыць, што вы ўпоперак губернатару станеце, трэба разумна ўсё ўзгадняць», — сказаў Прэзідэнт, падкрэсліўшы, што кадры вырашаюць усё.

Адбыліся змены і ў мясцовай вертыкалі ўлады. Аляксандр Цывака, які працаваў намеснікам старшыні Стаўбцоўскага райвыканкама, узначаліў Жодзінскі гарвыканкам.

## ФРОНТ РАБОТЫ ВЫЗНАЧАНЫ

Прэзідэнт узгадніў новых кіраўнікоў дзяржаўных арганізацый. Валерый Кавалёў — новы генеральны дырэктар канцэрна «Белпалівагаз», да гэтага ён быў намеснікам генеральнага дырэктара гэтага прадпрыемства. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што міністр энергетыкі Аляксей Кушнарэнка ў міністэрства перайшоў з пасады гендырэктара «Белпалівагаза». Асобна беларускі лідар вылучыў работу прадпрыемства ў развіцці сваіх філіялаў у галіне сельскай гаспадаркі. У прыклад ён прывёў сельгаспрадпрыемства «Газавік-Сіпакова» ў Шклоўскім раёне, якое наведваў асабіста. «Вы проста малайцы, разумна падышлі ў сельскай гаспадарцы да гэтага прадпрыемства. Праўда, апошнім часам не ведаю, як яно працуе, але, думаю, горш не працуе, і эканамічна, і гэтак далей. Таму я так блізка пачаў глядзець на ваша аб'яднанне, на ваш канцэрн і бачу, што ў вас там хлопцы моцныя, — адзначыў ён. — Велізарнае аб'яднанне, яно працуе. Слабакоў там, мусіць, не трымаюць».

Беларускую нафтавую кампанію ўзначаліў Марат Малецкі. Што датычыцца яе дзейнасці, то, паводле слоў Прэзідэнта, спецыялісты, якія там працуюць, недазагружаны. «Шкада гэтых спецыялістаў, ведаю, што там вельмі добрыя спецыялісты. Нам трэба моцна вызначацца з Беларускай нафтавай кампаніяй. Яна павінна быць загружана пад завязку. Калі не, значыць, гэтыя спецыялісты павінны працаваць па спецыяльнасці па ўсёй краіне», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Новаму кіраўніку Беларускай нафтавай кампаніі Марату Малецкаму ён паставіў задачу — дакладна вызначыцца: быць ці не быць кампаніі. «А для таго, каб быць, трэба фронт работы вызначыць. Я думаю, вызначыцеся», — падкрэсліў беларускі лідар.

ААТ «Мінск-Крышталь» — упраўляючую кампанію холдынга «Мінск Крышталь Груп» узначаліў Андрэй Дземідавец. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ААТ «Мінск-Крышталь» цалкам кіруецца дзяржавай, паколькі ў нашай краіне дзейнічае поўная манаполія на вытворчасць і рэалізацыю алкагольнай прадукцыі. «Мы ад гэтага адыходзіць не будзем, хаця да нас прэтэнзіі прад'яўлялі многія дружалюбныя нам краіны. Трэба трымаць пад кантролем увесь алкаголь. Тытунёвыя вырабы, алкаголь фарміруюць бюджэт прыстойна. І гэта ж здароўе людзей. Я не памятаю, каб дзяржаўныя прадпрыемствы падсунулі камусьці гадасць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён зрабіў акцэнт на тым, што дзяржаўны кантроль за вытворчасцю алкагольнай і тытунёвай прадукцыі захаваецца. «І мы вельмі спадзяёмся, што вядучае прадпрыемства ў нас будзе ў парадку», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

***

Дзмітрый Шляхцін, начальнік сакратарыята ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь», узгоднены на пасаду першага намесніка міністра культуры. Рыгор Глазко стаў першым намеснікам міністра транспарту і камунікацый, да гэтага ён працаваў начальнікам галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог у гэтым жа міністэрстве. Кандыдатура Алены Балігатавай узгоднена на пасаду намесніка міністра эканомікі, да гэтага яна была ў міністэрстве начальнікам галоўнага ўпраўлення стратэгічнага развіцця і міжнароднага супрацоўніцтва. Сяргей Адаменка заняў пасаду намесніка міністра энергетыкі, да гэтага ён працаваў намеснікам генеральнага дырэктара па капітальным будаўніцтве ў «Гроднаэнерга». Былы начальнік галоўнага ўпраўлення інфармацыйных тэхналогій Дзяржаўнага мытнага камітэта Дзмітрый Радзівонік — новы намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта. Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў кандыдатуру Сяргея Казакевіча на пасаду начальніка Сакратарыята Савета Рэспублікі. Раней ён быў намеснікам начальніка ўпраўлення планавання і кадравай работы Сакратарыята Савета Рэспублікі.

Аляксандрам Лукашэнкам узгоднена і кандыдатура новага дырэктара — галоўнага рэдактара Выдавецкага дома «Звязда». Гэту пасаду зойме Вольга Ануфрыева, якая да гэтага была галоўным рэдактарам газеты «Рэспубліка» Выдавецкага дома «Беларусь сегодня».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

### «Будзе праведзена сур'ёзная работа па экспарце культуры»

**Міністр культуры Руслан ЧАРНЕЦКІ** прызнаўся, што настрой баявы. Ён падкрэсліў, што за ўсе гэтыя гады выканана вялікая работа, але трэба зрабіць яшчэ больш. «Не сакрэт, што ўзровень культуры ў нас вельмі павысіўся, і нават нашы расійскія калегі ставяць нас у прыклад па многіх параметрах, і мы заўсёды жаданыя госці ў Расіі і краінах СНД», — сказаў ён. Руслан Чарнецкі падкрэсліў, што акцэнт будзе зроблены на развіццё кінематографа, аб чым казаў і Прэзідэнт. «Той узровень вытворчасці кіно, які ёсць цяпер, не задавальняе нікога: ні саміх кіношнікаў, ні гледача, для якога ўсё робіцца і які чакае ад нас гэта кіно, таму праца будзе вельмі сур'ёзная і вялікая», — адзначыў міністр. Ён згадаў словы Прэзідэнта аб тым, што кіно — гэта прадукт, і ён павінен быць цікавы максімальнай колькасці людзей, інакш навошта яго здымаць? «Гэта лагічна і справядліва. На культуру і кіно выдзяляюцца грошы, якія трэба як мінімум вярнуць. Таму будзе праведзена сур'ёзная работа па экспарце нашай культуры, у нас ёсць што прадаваць, у нас ёсць што паказаць», — канстатаваў Руслан Чарнецкі. Другім кірункам ён назваў узаемадзеянне з замежнымі партнёрамі, найперш з Расіяй і краінамі СНД.

Журналісты пацікавіліся ў новага міністра, ці будзе ён сумяшчаць міністэрскую працу з акцёрскай дзейнасцю. Адказ адназначны: «Так».

### У супрацоўніцтве з Туркменістанам ёсць куды імкнуцца

Станіслаў Чапурны, Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Беларусі ў Туркменістане, адзначыў, што дзве краіны звязвае сяброўства з моманту набыцця імі суверэнітэту. Сёння краіны эфектыўна ўзаемадзейнічаюць на міжнародных пляцоўках. Пасля пандэміі аднавілася ўзаемадзеянне ў сферы адукацыі, культуры, спорту, дзейнічае міжурадавая камісія ў галіне навукі і тэхналогій. «Кіраўнік дзяржавы асабліва падкрэсліў развіццё гандлёва-эканамічных адносін з Туркменістанам. Эканомікі нашых краін шмат у чым узаемадапаўняльныя, ёсць шэраг кірункаў для супрацоўніцтва, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Гэта найперш прамысловасць, сельская гаспадарка, транспартная сфера. Кіраўніком дзяржавы пастаўлены канкрэтныя задачы па развіцці супрацоўніцтва з Туркменістанам. Беларускі бок гатовы развіваць усебаковае супрацоўніцтва і накіраваны на канструктыўны і прадукцыйны дыялог», — падкрэсліў Станіслаў Чапурны.

### Задачы празрыстыя і канкрэтныя

Сяргей Налівайка падкрэсліў, што ўсе задачы на новай пасадзе цалкам зразумелыя. «Што датычыцца спецыфікі ўсходняга рэгіёна, то пра Магілёўскую вобласць можна сказаць, што там своеасаблівы сімбіёз прамысловасці (яна даволі сур'ёзна развіта) і сельскай гаспадаркі. Тут неабходна працаваць над дзвюма гэтымі часткамі, чым і будзем займацца», — сказаў ён. Што датычыцца кадравых падыходаў, то Сяргей Налівайка адзначыў: яны даўно вызначаны — прынцыповасць, сумленнасць і поўная самааддача справе. Па яго словах, менавіта імі ён і будзе кіравацца на новай пасадзе.

---

Парламенцкі дзённік

# НЕ НОВАЯ, АЛЕ ВАЖНАЯ ЗАДАЧА

## Як будзе развівацца будаўніцтва ў невялікіх паселішчах

**У горадзе Глыбокае Віцебскай вобласці прайшло выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі па тэме «Будаўніцтва жылых дамоў і інфраструктуры ў населеных пунктах з колькасцю насельніцтва 20 тысяч чалавек і менш».**

Адкрываючы выязное пасяджэнне, **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** адзначыла, што адным з асноўных напрамкаў у развіцці нашай краіны, вызначаных VI Усебеларускім народным сходам, з'яўляюцца моцныя рэгіёны. Пільная ўвага да ўстойлівага рэгіянальнага развіцця невыпадковая. Ад яго залежыць дабрабыт нашай краіны ў цэлым. Не толькі сталіца і абласныя цэнтры, але і сярэднія, малыя гарады, сельскія тэрыторыі павінны быць прывабнымі для жыцця.

«Выступаючы на абласным свяце працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2024» у Магілёўскай вобласці, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Моцныя рэгіёны — гэта моцная краіна! Такім шляхам мы будзем рухацца. Гэта ўжо не тактыка, гэта стратэгія». І наш нацыянальны лідар, паважаны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, чарговы раз абсалютна мае рацыю. Менавіта ў пятнаццацігоддзе рэгіёнаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь бачыць аснову для далейшага прагрэсу нашай дзяржавы. На жаль, магчымасці сельскіх тэрыторый, малых гарадоў задзейнічаны не ў поўную меру. Наша задача — калектыўнымі намаганнямі выпрацаваць падыходы, вызначыць ключавыя напрамкі для ўвасаблення ў жыццё гэтай стратэгіі», — сказала Наталля Качанава.

У Беларусі налічваецца 115 гарадоў, 85 пасёлкаў гарадскога тыпу, 22 991 сельскі населены пункт, з іх — 738 аграгарадкоў. У складзе тэрыторыі краіны гарадскія населеныя пункты складаюць 1,7 працэнта, сельскія населеныя пункты — 5,2 працэнта.

Як ідуць справы з будаўніцтвам жылля і над якімі праблемамі трэба плённа працаваць, расказаў **міністр архітэктуры і будаўніцтва Раман ПАРХАМОВІЧ.** Ён падкрэсліў, што за апошнюю пяцігодку ў сельскай мясцовасці пабудавана 6,4 мільёна квадратных метраў жылля. «За апошнія пяць гадоў колькасць сельскага насельніцтва знізілася на 8,5 працэнта, што ў сукупнасці са штогадовым будаўніцтвам жылля ў вёсцы абумовіла паказчык забяспечанасці 40,1 метра на чалавека. За пяцігодку ў сельскіх населеных пунктах было ўведзена ў эксплуатацыю каля 980 тысяч квадратных метраў жылля, 220 з іх — з дапамогай дзяржпадтрымкі».

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН** расказаў удзельнікам пасяджэння, якая сітуацыя з будаўніцтвам жылля склалася ў паўночным рэгіёне. «За студзень — кастрычнік 2024 года ў Віцебскай вобласці ўведзена ў эксплуатацыю 249,4 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылых дамоў, або 107,5 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года, у тым ліку ў сельскіх населеных пунктах і малых гарадах — 103,9 тысячы квадратных метраў. Індывідуальнымі забудоўшчыкамі ўведзена ў эксплуатацыю 143,1 тысячы квадратных метраў. На паляпшэнне жыллёвых умоў накіравана 533 шматдзетныя сям'і, што складае 106,6 працэнта гадавога задання, 529 шматдзетных сем'яў здабылі ўласнае жыллё», — адзначыў кіраўнік вобласці.

«Малыя гарады адыгрываюць істотную ролю ў фарміраванні шматграннай структуры нашай дзяржавы і грамадства, выступаюць найважнейшымі звёнамі рэгіянальнай эканомікі, выконваюць функцыі арганізацыйна-гаспадарчых цэнтраў для сельскай мясцовасці, у іх таксама засяроджана наша культурная спадчына. Якасная інфраструктура спрые паляпшэнню якасці жыцця і павышэнню прывабнасці рэгіёна. Яе наяўнасць не толькі ўтрымлівае насельніцтва, але і прыцягвае новых жыхароў, ствараючы тым самым спрыяльны фон для далейшага развіцця», — заключыла Старшыня Савета Рэспублікі.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

***Аб чым яшчэ ішла размова ў Глыбокім, чытайце ў заўтрашнім выпуску «Мясцовага самакіравання».***

Сталічны час

# РОСТ ЗАРОБКАЎ, МАДЭРНІЗАЦЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, ЖЫЛЛЁВАЕ БУДАЎНІЦТВА

## Мінск умацоўвае эканамічнае лідарства

**На чарговым пасяджэнні Мінскага гарвыканкама абмеркавалі сацыяльна-эканамічнае развіццё горада за дзевяць месяцаў. Так, у студзені — верасні бягучага года горадам забяспечана выкананне ўсіх мэтавых паказчыкаў, устаноўленых урадам. Карэспандэнт «Звязды» наведаў адказную нараду і высветліў падрабязнасці.**



Фота Агенцтва «Мінск-Навіны».

«Хацелася б пазначыць шэраг пытанняў, якія трэба дапрацаваць да канца года, — звярнуўся да прысутных **старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ.** — Сярод іх — увод аб'ектаў, якія мы плануем у першую чаргу, выкананне планаў па капітальным рамонце. Таксама неабходна забяспечыць засваенне сродкаў гарадской інвестпраграмы». Мэр таксама пацікавіўся, якія праблемы могуць узнікнуць да канца года, як будзе забяспечана рэалізацыя тых праграм, што запланаваны, і падкрэсліў: самае галоўнае — усе задачы, якія былі пастаўлены перад гарвыканкамам сёлета, павінны быць выкананы ў поўным аб'ёме.

### Экспарт і імпартазамяшчальная прадукцыя

**Старшыня камітэта эканомікі Мінскага гарвыканкама Аляксандр ЯЎСЕЕЎ** паведаміў, што доля Мінска ў фарміраванні валавога ўнутранага прадукту краіны складае каля трэці: «Валавы рэгіянальны прадукт Мінска як асноўны паказчык, які характарызуе работу эканомікі горада, склаўся ў аб'ёме 56,1 мільярда рублёў з тэмпам росту 105,2 працэнта. У структуры валавога рэгіянальнага прадукту найбольшы прырост паказалі апрацоўчая прамысловасць, гандаль, будаўніцтва, транспартная дзейнасць, а таксама аказанне паслуг па часовым пражыванні і харчаванні».

Па яго словах, за дзевяць месяцаў 2024 года ў Мінску выраблена імпартазамяшчальнай прадукцыі на суму 1579,6 мільёна долараў, што на 7,8 мільёна вышэй задання, устаноўленага ўрадам Беларусі. Экспарт гэтай прадукцыі склаў 519,7 мільёна долараў. Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў сталічных арганізацый павялічылася на 18,7 працэнта, дасягнуўшы 2963,5 беларускіх рублёў. Гэта самы высокі ўзровень у краіне. Тэмп росту рэальнай заработнай платы склаў 112,2 працэнта.

Нашы тавары і паслугі запатрабаваны ў 198 краінах свету. «За даволі кароткі тэрмін наша краіна стала паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, у сувязі з чым адміністрацыям раёнаў сумесна з найбуйнейшымі арганізацыямі-экспарцёрамі неабходна падрабязна вывучыць структуру экспарту тавараў у гэтыя рэгіёны і, выкарыстоўваючы магчымасці пасольстваў, на аснове наяўных дамоўленасцяў актыўна прасоўваць беларускую прадукцыю на рынак краін ШАС, у тым ліку пашырыць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва з КНР», — падкрэсліў Аляксандр Яўсееў.

Ён дадаў, што за справаздачны перыяд экспарт тавараў і паслуг дасягнуў 11,1 мільярда долараў, дзе рост экспарту тавараў склаў 8,7 працэнта, а паслуг — 5,9 працэнта: «Мы актыўна працуем над дыверсіфікацыяй рынкаў, пашырэннем прысутнасці ў Расіі, краінах Азіі і Афрыкі», — расказаў старшыня камітэта эканомікі.

### Інавацыі і прамысловасць

Сталіца робіць стаўку на ўкараненне інавацый, вытворчасць высокатэхналагічных тавараў, у тым ліку імпартазамяшчальных. «Штогод у горадзе павялічваецца ўдзельная вага інавацыйнай прадукцыі. За студзень — верасень яна склала 28,2 працэнта. На стварэнне інавацыйных вытворчасцяў з бюджэту горада Мінска выдзяляюцца немалыя беспрацэнтныя і беззваротныя сродкі. Разам з тым не ўсе кіраўнікі адказна падыходзяць да пытання асваення гэтых рэсурсаў. Адставанне ад графіка ставіць пад пагрозу зрыву выканання распараджэння Прэзідэнта», — падкрэсліў Аляксандр Яўсееў.

Мінск па-ранейшаму застаецца прывабным для інвестараў. «Прамыя замежныя інвестыцыі на чыстай аснове склалі 825 мільёнаў долараў, што перавышае палову ад агульнага аб'ёму па краіне — 54,2 працэнта, — адзначыў Аляксандр Елісееў. — Арганізацыямі Мінска асвоена шэсць мільярдаў беларускіх рублёў інвестыцый у асноўны капітал, што адпавядае тэмпу росту 111,9 працэнта. Амаль палова ўкладанняў (48,8 працэнта) прыйшлася на будаўніча-мантажныя работы, аб'ём якіх склаў 2,9 мільярда рублёў з тэмпам росту 107,6 працэнта.

Традыцыйна адным з асноўных драйвераў эканамічнага развіцця ў сталіцы выступае прамысловасць, якая паказвае ўстойлівы рост. «Індэкс прамысловай вытворчасці ў супастаўных умовах склаў 109,6 працэнта. Высокія паказчыкі прадэманстравалі прадпрыемствы, якія працуюць на мясцовай сыравіне. Напрыклад, у прамысловасці будаўнічых матэрыялаў вытворчасць вырасла на 11,7 працэнта, у тэкстыльнай прамысловасці — на 16,2 працэнта, вытворчасць цэлюлозы, паперы і кардону — на 19,6 працэнта. Флагман, вядома, — машынабудаванне. Вытворчасць машын і абсталявання павялічылася на 18 працэнтаў», — заўважыў старшыня камітэта эканомікі Мінгарвыканкама.

Адным з жорсткіх патрабаванняў кіраўніка дзяржавы з'яўляецца кантроль за ростам цэн. Па словах Аляксандра Яўсеева, індэкс цэн вытворцаў прадуктаў харчавання, напояў і тытунёвых вырабаў склаў 104,5 працэнта пры заданні не больш за 102,6 працэнта: «Я прашу «Сталічны гандаль і паслугі» і адміністрацыі раёнаў узяць сітуацыю на кантроль, прыняць меры па забеспячэнні выканання ўстаноўленых урадам на 2024 год нарматываў — не больш за 103,5 працэнта», — падкрэсліў ён.

Гаворачы аб мадэрнізацыі прадпрыемстваў, Аляксандр Яўсееў акцэнтаваў, што яна ідзе апераджальнымі тэмпамі, а тэмп росту выдаткаў на набыццё машын, абсталявання і транспарту дасягнуў 119,3 працэнта (2,7 мільярда рублёў).

### Будаўніцтва жылля і даходы

У сталіцы працягваецца актыўнае жыллёвае будаўніцтва. Уведзена ў эксплуатацыю 364,7 тысячы квадратных метраў жылля, што складае 52,9 працэнта ад гадавога аб'ёму. «Выкананне не ў поўным аб'ёме задання па ўводзе ў эксплуатацыю жылля абумоўлена невыкананнем абавязацельстваў заказчыкамі па будаўніцтве жылых дамоў у складзе эксперыментальнага шматфункцыянальнага комплексу «Мінск-Свет». Другі паказчык, які горад не выканаў, — увод у эксплуатацыю жылля з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі. За дзевяць месяцаў 2024 года ўведзена 48,4 тысячы квадратных метраў жылля пры заданні ўрада 100,8 тысячы квадратных метраў», — заўважыў старшыня камітэта эканомікі Мінгарвыканкама.

Па яго словах, плошча жылога фонду, капітальна адрамантаванага сёлета, склала 690,3 тысячы квадратных метраў пры плане 755,1 тысячы. «Хачу звярнуць увагу, што заданне ўстаноўленай дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2024 год складае не менш за тры працэнты ад жыллёвага фонду, або 1 080 000 квадратных метраў, якія павінны быць выкананы безумоўна».

Даходы бюджэту горада за дзевяць месяцаў павялічыліся на 15,8 працэнта. Рознічны таваразварот вырас на 21,8 працэнта (21,5 мільярда рублёў), аптовы — на 7,6 працэнта (72,9 мільярда рублёў), а грамадскага харчавання — на 15 працэнтаў (2,1 мільярда рублёў).

«У цэлым эканоміка горада ў студзені — верасні спрацавала эфектыўна. Выручка ад рэалізацыі прадукцыі вырасла на 18,2 працэнта, прыбытак ад рэалізацыі прадукцыі — на 11,4 працэнта, чысты прыбытак — на 17,7 працэнта. Колькасць стратных арганізацый у параўнанні з пачаткам года скарацілася на 150 і склала 221 прадпрыемства. Сума чыстай страты склала 884,9 мільёна рублёў і знізілася ў адносінах да аналагічнага перыяду мінулага года на 125,5 мільёна рублёў», — дадаў Аляксандр Яўсееў.

У сферы выдаткаў на вытворчасць і рэалізацыю прадукцыі зніжэнне склала 1,2 працэнта, што адпавядае ўстаноўленым заданням. «Мінскі гарвыканкам актыўна працуе над захаваннем эканамічнай стабільнасці сталіцы, выкананнем сацыяльных гарантый і падтрымкай прадпрыемстваў і жыхароў горада. З улікам становічай дынамікі плануем скончыць год у параметрах, не ніжэйшых за ўстаноўленыя ўрадам», — падагуліў старшыня камітэта эканомікі Мінгарвыканкама.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

Надвор'е

# Снежань стартуе анамальным цяплом

## З чацвярга трохі пахаладае, але ненадоўга

**У апошнія гады пачатак зімы надыходзіць у нас значна пазней, чым звычайна. І гэты год не выключэнне. У пачатку снежня ў краіне захаваецца цёплае надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Першы тыдзень месяца пачаўся з цёплага надвор'я з сярэднесутачнай тэмпературай паветра, якая на 3-5 градусаў перавышае шматгадовыя значэнні. Пры ваганнях тэмпературнага фону месцамі па краіне будуць утварацца туманы і слабыя галалёдныя з'явы. Асобныя ўчасткі дарог стануць слізкімі, прагназуюць сіноптыкі.

У аўторак надвор'е ў Беларусі ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў вільготнай паветранай масе. Раніцай і днём па паўночным захадзе краіны адаб'ецца ўплыў франтальнага падзелу, які ссоўваецца з боку Балтыйскага мора. Чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Ноччу пераважна без ападкаў, раніцай і днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу.

Ноччу і раніцай у асобных раёнах краіны будуць адзначацца туман, слабы галалёд. Вецер паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, максімальная днём — ад 1 марозу да 4 цяпла. Атмасферны ціск будзе слаба падаць.

У сераду надвор'е ў асноўным будзе вызначаць малярухомы франтальны раздзел. Чакаецца воблачнае надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах краіны будуць адзначацца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер няўстойлівы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы ад 5 марозу да 2 цяпла, максімальная днём складзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла.

У чацвер месцамі па Беларусі чакаецца невялікі кароткачасовы снег, мокры снег. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Ноччу і раніцай месцамі па захадзе краіны чакаюцца слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра мінімальная ноччу — ад мінус 6 градусаў па ўсходзе рэгіёна да плюс 2 градусаў па захадзе, максімальная днём — мінус 3 — плюс 3 градусы.

У пятніцу часова пахаладае. У гэты дзень месцамі па краіне чакаюцца невялікі кароткачасовы снег, мокры снег, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад нуля да мінус 7 градусаў, ды і максімальная днём складзе ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, ужо ў гэтыя выхадныя ў фарміраванне надвор'я зноў уключыцца цёплая Атлантыка. Тэрыторыя краіны апынецца ва ўладзе атмасферных франтоў, за якімі пачне паступаць цёплае акіянічнае паветра.

Таму ў суботу на большай частцы тэрыторыі краіны ападкі будуць у выглядзе снегу і мокрага снегу, днём з дажджом. У асобных раёнах могуць быць слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла, а ўдзень — мінус 2 — плюс 4 градусы.

Мокры снег з дажджом прагназуецца і ў нядзелю. У асобных раёнах можа быць слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 3 — плюс 2 градусы, а ўдзень — ад мінус 1 градуса да 5 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ТЫСЯЧЫ СЭРЦАЎ ВА ЎНІСОН



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Менавіта адзінства з'яўляецца асновай далейшага росквіту Беларусі. Калі мы адзіныя, мы можам пераадолець любыя цяжкасці на шляху да будучыні, напоўненай новымі магчымасцямі, — такім быў лейтматыў канцэртаў у вытворчых цэхах. Праект знайшоў моцны водгук у сэрцах многіх работнікаў, «найлепшы цімбілдынг» — менавіта так ахарактарызавалі канцэрты рабочыя ўсіх узростаў.

Яшчэ адзін важны праект быў рэалізаваны на пляцоўках Віцебскага футравага камбіната і вытворчага аб'яднання «Энергакамплект». У рамках ініцыятывы «Адну справу робім» калектыў і кіраўніцтва камбіната сустрэліся з калегамі прадпрыемстваў «Чырвоны Кастрычнік» і «ВітМА», якія з'яўляюцца часткай холдынга «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка». Працаўнікі змаглі напрамую задаць пытанні заснавальніку холдынга Мікалаю Мартынаву. «Для таго каб дасягнуць усяго таго, што мы задумалі, патрэбен прамы кантакт, вочы ў вочы. Такое ўзаемадзеянне дае свае вынікі. Гэта больш эфектыўна, чым абмяркоўваць справы па тэлефоне на адлегласці», — падвёў вынікі сустрэчы з калегамі Мартынаў.

Вытворчае аб'яднанне «Энергакамплект» прымала ў Віцебску работнікаў завода «Палімір» ААТ «Нафтан», прадпрыемствы супрацоўнічаюць ужо 30 гадоў. Кіраўнікі прамысловых флагманаў запэўнілі, што цеснае супрацоўніцтва дазваляе выпускаць якасныя тавары і дасягаць высокіх вынікаў, а калектывы не сапернічаюць паміж сабой. Генеральны дырэктар ВА «Энергакамплект» Андрэй Аўко, звяртаючыся да ўдзельнікаў сустрэчы, адзначыў, што сіла не ў грошах, а ў людзях, якія робяць прадпрыемствы такімі, якія яны ёсць сёння. Не абышоўся праект на прадпрыемствах без музычных падарункаў.

## Наш агульны шлях

У Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава са студэнтамі вышэйшых навучальных устаноў горада сустрэўся Уладзімір Андрэйчанка ў рамках праекта «Маё жыццё. Мой выбар. Мой Прэзідэнт». Уладзімір Паўлавіч — знакавая асоба не толькі для краіны, але і для Віцебшчыны. З'яўляючыся старшынёй Віцебскага аблвыканкама з 1994 да 2008 года, ён зрабіў вялікі ўнёсак у развіццё вобласці, паўплываў на ўмацаванне стабільнасці ў краіне як член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага, другога і трэцяга скліканняў, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу з кастрычніка 2008 да сакавіка 2024 года.

Яго размова са студэнтамі сапраўды атрымалася адкрытай. Уладзімір Андрэйчанка многія гады працаваў побач з Прэзідэнтам і змог расказаць, колькі сіл прыклаў кіраўнік дзяржавы, каб Беларусь стала моцнай, экспартна арыентаванай краінай з развітой прамысловасцю, сектарам паслуг і сельскай гаспадаркай, самастойна ажыццяўляла ўнутраную і знешнюю палітыку, каб краіна выпрацавала мадэль сацыяльна арыентаванай рынкавай эканомікі, якая даказала сваю эфектыўнасць. «1990-я гады для нашай краіны былі цяжкімі. Добра, што з'явіўся такі чалавек, як Аляксандр Лукашэнка, які ведаў, што трэба народу і краіне: аднавіць і нарошчваць інтэграцыю з Расіяй, даць рускай мове, на якой гаварыла 80 працэнтаў насельніцтва Беларусі, статус дзяржаўнай, захаваць нашы прадпрыемствы-гіганты. Падыходы, якія былі выкладзеныя тады дэпутатам Аляксандрам Лукашэнкам, былі зразумелыя народу, і народ яго падтрымаў. Старэйшае пакаленне памятае, як раней беларусы на рэферэндуме выказаліся за захаванне Савецкага Саюза, але, нягледзячы на гэта, у Белавежскай пушчы ў 1991 годзе ўсё вырашылі інакш, 15 саюзных рэспублік разышліся. Людзі хацелі адзінства, а палітыкі да іх не прыслухаліся, і толькі Аляксандр Лукашэнка быў салідарны з меркаваннем народа. І цяпер Прэзідэнт думае і клапоціцца перш за ўсё пра дабрабыт і інтарэсы краіны, менавіта таму людзі яму давяраюць і бачаць у ім свайго нацыянальнага лідара», — расказаў Уладзімір Андрэйчанка.




На сустрэчы са студэнтамі і прадстаўнікамі грамадскасці ён гаварыў пра адказнасць моладзі за будучыню Беларусі, пра пераемнасць пакаленняў і пра важнасць бягучай электаральнай кампаніі.

Пасля адкрытай размовы малады спецыяліст ВДУ імя П. М. Машэрава Анастасія Ярошчанка адзначыла, што такія мерапрыемствы патрэбныя ўсім маладым грамадзянам нашай краіны. «Гэта неацэнны шанц мець зносіны з людзьмі, якія дасягнулі вяршынь, дасведчаныя, якія «шышкі» яны набілі ў працэсе станаўлення, у тым ліку ў палітычнай кар'еры. Цяпер вялікая колькасць моладзі імкнецца ў палітыку, і магчымасць такога жывога дыялогу з дзяржаўнымі дзеячамі каштуе дорага».

## Новыя бібліятэчныя магчымасці

150 экзэмпляраў кніг і сертыфікат на падключэнне да электронных рэсурсаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі атрымала Віцебская абласная бібліятэка імя У. Леніна, на пляцоўцы якой быў рэалізаваны праект «Веды без меж».

«Марафон адзінства» пастаянна пашырае кола праектаў у тым ці іншым рэгіёне. Сутнасць нашай акцыі — паказаць інтэлектуальнае і культурнае адзінства нашай краіны праз кнігу, электронныя рэсурсы. Ёсць такое панацце — «сацыяльна значная літаратура». Можа, гэта гучыць некалькі бюракратычна, насамрэч гэта карысныя, важныя, актуальныя айчынныя выданні, якія паступаюць у Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Гэта кнігі пра Вялікую Айчынную вайну, генацыд беларускага народа, які праводзілі акупанты, пра нашых партызан, падпольшчыкаў, пра сучаснасць Беларусі, эканоміку, культуру, пра віцебскую зямлю. Гэта растаноўка арыенціраў, прыярытэтаў, якія дапамагаюць выбудоўваць выхаваўчую работу. Мы дзелімся такой літаратурай з іншымі бібліятэкамі краіны», — адзначыў **генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Вадзім ГІГІН.**

Таксама раённым бібліятэкам Вадзім Францавіч уручыў сертыфікаты на доступ да электронных рэсурсаў галоўнай бібліятэкі Беларусі. У Нацыянальнай бібліятэцы ёсць каля 700 тысяч алічбаваных дакументаў, для агульнага доступу прадастаўлена каля 130 тысяч выданняў. Цяпер жыхары раёнаў паўночнага рэгіёна змогуць атрымліваць доступ да іх, загадзя даведвацца, ці ёсць у Нацыянальнай бібліятэцы той ці іншы асобнік, і замаўляць яго.

## Пра сутнасць «чацвёртай улады»

На пляцоўцы фудкорту ў гандлёва-забаўляльным цэнтры «ТРЫА» 30 лістапада было як ніколі шматлюдна. Тут праходзіла «Знакавая сустрэча» моладзі і прадстаўнікоў грамадскасці са старшынёй Белтэлерадыёкампаніі Іванам Эйсмантам, генеральным дырэктарам БелТА Ірынай Акуловіч, а таксама з галоўным рэдактарам «Альфа Радыё» Вадзімам Шэпетам. У нефармальнай абстаноўцы спікеры тлумачылі, як не трапіць на інфармацыйныя фэйкі і адказвалі на хвалюючыя пытанні, у ліку якіх былі дзейнасць блогераў, пачатак журналісцкай кар'еры, правільнае арыентаванне ў інфармацыйным патоку і многія іншыя.

Іван Эйсмант распавёў пра тэндэнцыі развіцця медыяпрасторы. «Раней былі інтэрнэт, радыё, тэлебачанне. У наш час важная аператыўнасць падачы інфармацыі, як у інтэрнэце. Акрамя таго, цяпер усё змяшалася. Напрыклад, на радыё практычна кожная студыя абсталявана відэакамерай», — адзначыў ён і звярнуў увагу ўдзельнікаў сустрэчы на канкрэтныя прыклады інфармацыйных фэйкаў, на якія трапляюцца нашы суайчыннікі, і аб наступствах дэзынфармацыі не толькі на бытавым, але і на дзяржаўным узроўні.

## У атмасферы свята

У другі дзень «Марафону адзінства» традыцыйны мурал «Будучыня Беларусі ў тваіх руках» упрыгожыў



сцяну віцебскага Лядовага палаца спорту, дадаўшы яркія фарбы ў гарадскі пейзаж. Адметна, што ў Віцебску выяў з далонямі сям'і з'явілася дзве. Праект быў рэалізаваны дзякуючы сумесным намаганням Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў ГА «БРСМ», Віцебскага абласнога штаба студатрадаў, абласнога і гарадскога выканкамаў.

Адначасова з адкрыццём муралу стартаваў гарадскі квэст «Гэта ўсё маё роднае», які пабіў некалькі рэкордаў рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі. Так, у інтэлектуальным і творчым спаборніцтве ўдзельнічалі 86 каманд, 775 чалавек. Тры каманды набралі максімальную колькасць балаў, адказваючы на пытанні па гісторыі краіны і горада на Дзвіне, — 120.

Упершыню падчас правядзення «Марафону адзінства» была прэзентавана выстава Міністэрства аховы здароўя «Беларусь. Медыцына. Будучыня», якая размясцілася на пляцоўцы ВДМУ. На ёй усе ахвотныя маглі азнаёміцца з інавацыйнымі распрацоўкамі ў сферы медыцыны і фармацыі, паспрабаваць свае сілы на медыцынскіх манекенах, трэнажорах, сімулятарах і інш.

Таксама ўпершыню ў рамках рэспубліканскай акцыі ў Віцебск прыехала спартыўная каманда па ралі-рэйдах МАЗ-СПОРТаўта. Удзельнікі свята атрымалі плакаты з легендарным грузавіком і аўтографы ад членаў каманды.

Яркім акордам двухдзённага марафону ў культурнай сталіцы стаў канцэрт "Час выбраў нас", які прайшоў у Лядовым палацы спорту. На сцэне натхнялі шматтысячную залу энергіяй Вікторыя Алешка, гурт «Аўра», Насця Краўчанка, Ганна Благава, Мікіта Бялько, арт-гурт «Беларусы», фолк-гурт «Добрыя людзі», заслужаныя аматарскія калектывы Рэспублікі Беларусь.

Адкрываючы канцэрт, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Дзмітрый Крутой адзначыў, што, прыязджаючы ў нашу краіну з-за замежжа, людзі хочуць вельмі простых рэчаў. «Напрыклад, хочуць жыць у бяспецы, што цяпер, аказваецца, вялікая раскоша і прывілей. Хочуць расціць і вучыць сваіх дзяцей без агрэсіўных заходніх каштоўнасцяў, якія імкнуцца навязваць. Набываць натуральныя і экалагічна чыстыя прадукты, нармальна працаваць і зарабляць. Прэзідэнт часта гаворыць: для таго каб захаваць гэта спакойнае жыццё, якое мы разам пабудавалі, неабходна быць адзінымі, згуртаванымі і маналітнымі як нацыя. Тады ў нас усё атрымаецца», — сказаў Дзмітрый Крутой.

«Марафон адзінства» развітаўся з горадам на Дзвіне, пакінуўшы яго жыхарам незабыўныя эмоцыі і поўнае адчуванне таго, што ты не адзін — нас мільёны. Ужо ў наступную пятніцу эстафету акцыі прыме горад Орша.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

Эксклюзіў

# «Я яго абсалютная копія»

## Мікалай Лукашэнка аб парадах бацькі, сямейных традыцыях, «Марафоне адзінства» і сацсетках

**Нумар, дзе сын Прэзідэнта Мікалай Лукашэнка і яго выкладчык Алена Асташкіна-Мысліўчык іграюць на раялях, стаў яркай часткай канцэрта «Час выбраў нас», які традыцыйна завяршае рэспубліканскую грамадска-культурную акцыю «Марафон адзінства». Карэспандэнтам БелТА ўдалося пагутарыць з Мікалаем Лукашэнкам перад канцэртам у Віцебску. Сын Прэзідэнта расказаў, як з'явілася задума гэтага выступлення, што ён укладвае ў такое ўсёабдымнае паняцце, як адзінства, і ці ёсць у яго сацыяльныя сеткі.**



Мікалай Лукашэнка на «Марафоне адзінства» ў Віцебску.

Фота БелТА.

**«Канцэрт у прыватнасці і «Марафон» у цэлым я ўспрымаю з велізарнай удзячнасцю»**

***— Мікалай, вы ўдзельнічаеце практычна ў кожным «Марафоне адзінства». Для вас гэта нейкі абавязак ці ўсё ж ёсць і нейкая асабістая зацікаўленасць, дзе ў аснове творчы, эмацыянальны складнік? Эмоцыі залы, якія адчуваліся на вашым выступленні ўжо 17 верасня ў «Мінск-Арэне», — гэта нешта неймавернае.***

— Улічваючы наш вопыт выступленняў, я прапанаваў, што мы маглі б паставіць нядрэнны нумар і паказаць яго на канцэрце ў «Мінск-Арэне» 17 верасня. Паказаць, як мы бачым народнае адзінства. Потым гэты нумар стаў дастаткова значнай вяхой канцэрта «Час выбраў нас». Не таму што мы яго стварылі або я там выступаю, а менавіта за кошт пасылу і маштабу. І мы вырашылі, так сказаць, замацаваць яго на «Марафоне адзінства», каб больш людзей убачылі яго.

***— А як вам удаецца сумяшчаць вучобу і графік «Марафону адзінства»? Ці ёсць нейкі сакрэт, як усё паспяваць?***

— Калі на чалавеку ляжыць адказнасць, ён мабілізуецца і прыкладае ўсе намаганні. Так гэта працуе ў маім выпадку. Я адчуваю на сабе вялікую адказнасць.

Ну і хачу сказаць, што гэта ж не першы раз, калі ў мяне такая нагрузка. Я многа чым займаюся. Вы шмат чаго бачыце па тэлевізары, а ёсць яшчэ больш таго, што не бачна. Таму канцэрт у прыватнасці і «Марафон» у цэлым я ўспрымаю з велізарнай удзячнасцю. У мяне ёсць магчымасць увасобіць тут нейкія свае творчыя ідэі, працаваць разам з калектывамі. Тут жа працуе шмат людзей, якія траціць сіл і энергіі, напэўна, яшчэ больш, чым я. І я разумею, што ёсць вялікая колькасць 20-гадовых хлопцаў, якія могуць не горш за мяне зрабіць гэту работу. Можа, больш таленавіта ў плане выкання гэтай кампазіцыі. Я маю на ўвазе прафесіянальных артыстаў. Але гэта раблю менавіта я. Я расцэньваю гэта як вялікую магчымасць і стаўлюся да гэтага з вялікай удзячнасцю, таму для мяне гэта шчасце.

***— А чаму вы выбралі такі музычны інструмент, як раяль?***

— Ён адзін з самых класічных. Гэты інструмент самадастатковы, як мне здаецца. А так, я сказаў бы, што ў мяне былі роўныя шанцы займацца, напрыклад, і вакалам. Але я заняўся раялем і іграю ўжо 11-ы год.

**«Калі дарослыя людзі лічаць, што перараслі такія каштоўнасці, як мір і дабро, і пачынаецца гібель народа і будучыні»**

***— А ці ёсць у вас любімы нумар у праграме «Час выбраў нас»?***

— Я люблю розныя нумары. Вельмі падабаюцца дзіцячыя нумары — яны ўвасабляюць наогул усё, што мы паказваем у гэтым «Марафоне». Просты дзіцячай мовай яны даносяць фундаментальныя, вельмі складаныя ісціны, якія мы, дарослыя, забылі, перараслі. Або лічым, што перараслі. Якое дабро, які мір? Мы ж дарослыя людзі. Менавіта ў гэты момант, я лічу, і пачынаецца гібель народа, гібель людзей і гібель будучыні. Калі дарослыя людзі лічаць, што яны перараслі дабро, перараслі мір. Таму трэба слухаць дзяцей і з усіх сіл захоўваць прыцягненне дабра.

***— А што для вас адзінства?***

— Складана падабраць канкрэтны адказ на гэта пытанне. Адзінства — гэта сувязь пакаленняў, гэта тое, як мы глядзім на дзяцей. Адзінства — гэта тое, як мы аддаём сябе не толькі блізкім людзям, але і свайму кавалку зямлі, на якім мы жывём. Адзінства ў імкненні, у самааддачы. Напэўна, тое, аб чым спяваецца ў гімне: «Сэрцам аддавыя роднай зямлі». Рабіць нешта для грамадства, бачыць сябе часткай вялікай справы. Жыць не для сябе і не ў сваё задавальненне, а для таго, каб іншым людзям жылося лепш кожны дзень. Каб мы яшчэ нешта перадалі наступным пакаленням.

**«Вядома, стараюся сфарміраваць максімальна аб'ектыўнае меркаванне аб усіх падзеях»**

***— Кіраўнік дзяржавы жартам называе вас «галоўным апазіцыянерам у сям'і». Ведаю, што вы чэрпаеце інфармацыю з самых розных крыніц, сацыяльных сетак.***

— Так, я чытаю розныя крыніцы інфармацыі. І, вядома, стараюся сфарміраваць максімальна аб'ектыўнае меркаванне аб усіх падзеях. Я маю такую магчымасць: сказаць тое, што я бачу, прамалінейна. І я ніколі не замоўчу, калі ў нечым упэўнены. Я ніколі не цярплю нейкіх ілжывых захапленняў і ілжывых настрояў. Вядома, часта выказваю сваю думку. І таму мяне можна назваць «апазіцыянерам».

Але я не магу быць апазіцыянерам у адносінах да дзяржавы, да кіраўніка нашай дзяржавы, таму што я яго абсалютная копія. Некаторыя людзі гавораць, што я адрозніваюся ад свайго бацькі. Але гэтыя людзі або не ведаюць мяне, або не ведаюць майго бацькі.

Мой бацька ў маладосці таксама вельмі ажыўлена рэагаваў на нейкую несправядлівасць, нейкія спрэчныя моманты, якія ёсць у любым грамадстве, у любой дзяржаве. Пытанне толькі ў тым, як ты будзеш на гэта рэагаваць: маўчаць і нічога не рабіць або змагацца за людзей, за справядлівасць.

Кіраўнік дзяржавы гаспадарлівы, строгі, ён Прэзідэнт краіны. І я лічу яго абсалютна вялікім чалавекам. Мы з вамі кожны дзень бачым вынікі яго працы. А я бачу, як яны непасрэдна ствараюцца.

***— Так, у многіх жа разуменне такое: вось у кіраўніка дзяржавы прайшла нарада, якую паказалі ў СМІ, і на гэтым усё. Але ж мы не бачым, напэўна, і палову яго работы.***

— Вельмі вялікую частку работы не бачна. І людзі вынік гэтай работы часта ўспрымаюць як данасць.

***— А вы ведзяце сацсеткі?***

— Я не вяду сацсеткі. Вы ведалі б, калі б я іх вёў. Але я, зразумела, чытаю розныя сацсеткі. Гэта частка нашага жыцця. Немагчыма, напрыклад, не чытаць Telegram-каналы.

**«Я з абсалютнай павагай і вельмі вялікай увагай стаўлюся да парад бацькі»**

***— Зусім нядаўна — у час сустрэчы са студэнтамі лінгвістычнай ВНУ — Аляксандру Рыгоравічу было зададзена пытанне, як ён паставіцца да вашай спадарожніцы. У СМІ адказ на гэта пытанне не паказалі, але ўсім жа цікава. Можаце прыадкрыць тайну, ці ёсць у вас ужо выбранніца?***

— У глабальным маштабе кіраўнік дзяржавы — адзін чалавек. Але калі гаварыць пра яго ролю бацькі, то ён вельмі далікатны, вельмі клапатлівы. Зразумела, ён удзяляе мне вельмі вялікую ўвагу. Так было ад моманту майго нараджэння. І я лічу, што гэта яго асабісты подзвіг. Бо, з'яўляючыся такім чалавекам, у такія складаныя гады яго рабочай дзейнасці ён невераўгодную колькасць часу прысвячаў мне, майму выхаванню, каб я мог знаходзіцца побач з ім, мог вучыцца многім рэчам. Гэта ж аднімала ў яго вельмі шмат сіл і часу.

І я не сумняваюся, што да пытанняў майго асабістага жыцця ён будзе ставіцца з вельмі вялікай увагай. Вядома, я яму цалкам давяраю і прыслухоўваюся да яго меркавання. Многія падлеткі спрабуюць адхіляць меркаванне бацькоў. Можа, некалі ў мяне такое і было, але дакладна не цяпер. Я з абсалютнай павагай і вельмі вялікай увагай стаўлюся да парад бацькі. Не проста таму, што так трэба і заведзена, а таму што я ў гэтым перакананы на прыкладзе многіх падзей: ад самых глабальных да самых маленькіх, асабістых.

Але ўсе дэталі асабістага жыцця я не буду раскрываць, бо ў кожнага чалавека ёсць свае нейкія пытанні асабістага характару. І ў маёй сітуацыі гэта, напэўна, не тое, на чым трэба рабіць акцэнт.

**«Але вось спыніцца, выдыхнуць, паглядзець на вынік і перагарнуць старонку — гэта такая мінімальная, але вельмі важная навагодняя традыцыя»**

***— Хутка Новы год — час сямейных свят і традыцый. Для вас што важна ў гэты час? Чым займаецеся звычайна ў святочныя дні? І ці ёсць нешта, без чаго не ўяўляеце Новы год?***

— У нас сям'я вельмі вялікая, вы ведаеце. І мы імкнёмся неяк сабрацца і правесці час разам. Абсалютна спакойна пагутарыць за навагодняй вячэрай. Такая простая традыцыя. Сталыя традыцыі — іх вельмі вялікая колькасць у сям'і — патрабуюць стабільнасці. Але калі ты не ведаеш, дзе ты будзеш праз гадзіну ці дзве (вы, напэўна, як журналіст гэта выдатна разумееце), то цяжка выпрацаваць нейкія традыцыі і прытрымлівацца іх.

У нас уся сям'я задзейнічана ў тым, чым займаецца галава нашай сям'і, кіраўнік нашай дзяржавы. Мы ўсе за ім цягнемся. Нехта менш, нехта больш, але мы трапляем у той жа спосаб жыцця, што і ён. Асмелюся сказаць, што ледзь ці не ў большай ступені. Можна ў Новы год апынуцца ў любым пункце краіны і займацца вельмі рознымі пытаннямі. І часам нават не да Новага года бывае. Новы год — гэта вельмі напружаны час. Упэўнены, што і ў вас таксама.

Але вось спыніцца, выдыхнуць, паглядзець на вынік і перагарнуць старонку — гэта такая мінімальная, але вельмі важная навагодняя традыцыя. І мы яе прытрымліваемся.

***— А як хацелі б сустрэць 2025 год?***

— Хочацца сустрэцца з блізкімі людзьмі, убачыць больш членаў сваёй сям'і. Гэта ж таксама вельмі складана — сабраць усіх разам.

***— Разумею, што свабоднага часу ў вас зусім не шмат. Але калі выдаецца свабодны час, як лічыце за лепшае яго правесці?***

— Гэта базавае пытанне, якое ўсім задаюць: «Якое ў вас хобі?» Але ў мяне ўсе хобі перараслі ў нейкую каляпрафесійную дзейнасць. Або аматарскую дзейнасць, але з прафесійным падыходам. Можна сказаць, што хакей — маё хобі.

Я вось выступаю на «Марафоне адзінства», але тут няма ні аднаго чалавека, для якога выступленне тут — гэта хобі. Таму я павінен прафесійна рыхтавацца. Шмат ёсць усякіх заняткаў, якія маглі б быць хобі, але да іх я павінен падыходзіць (і з радасцю падыходжу) як прафесіянал.

***— Што для вас адпачынак?***

— Вельмі падабаецца чытаць. Нават сам працэс чытання, перагортвання старонак. З-за сваёй спецыяльнасці біятэхнолага я павінен чытаць тэхнічную, навуковую літаратуру. Я яе чытаю шмат: гэта навуковыя артыкулы, зборнікі, усякія навуковыя рэгламенты.

Навукова-папулярную літаратуру люблю за тое, што можна ставіць перад сабой нейкія пытанні. Не люблю за тое, што да рэальнага жыцця яна рэдка мае адносіны і не вырашае нейкія праблемы.

Мастацкую літаратуру я чытаю хоць бы для таго, каб удасканальваць навыкі размовы і пісьма. А вялікія мастацкія творы можна некалькі разоў у жыцці перачытваць.

**Андрэй ВАРАПАЙ.**

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»

### *24 декабря 2024 г.* проводит открытый *аукцион* по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право заключения договора аренды.

**Арендодатель имущества и организатор аукциона:** государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, тел. +375 (17) 516 80 64).

**Порядок проведения аукциона** определен Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049 (далее – Положение).

| № лота | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер арендной платы в БАВ* | Коэфф. спроса | Начальная цена права заключения договора аренды имущества / сумма задатка (руб.) | Целевое использование имущества | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1 | г. Минск, ул. Захарова, 104г (в гараже на 14 м/мест с инв. № 500/С-24097, общ. пл. 264 кв. м) | 33,1 | 41,38 | 2,5 | 146,96 | Любые цели, возможные на данных площадях | Гараж (боксы 21, 22). Имеется проходная на территории. Отдельный вход. Санузел совместно с другими арендаторами. Имеются: электроснабжение, отопление. Требуются: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 2 | г. Минск, ул. Захарова, 104г (в гараже на 14 м/мест с инв. № 500/С-24097, общ. пл. 264 кв. м) | 33,3 | 41,63 | 2,5 | 147,85 | Любые цели, возможные на данных площадях | Гараж (боксы 23, 24). Имеется проходная на территории. Отдельный вход. Санузел совместно с другими арендаторами. Имеются: электроснабжение, отопление. Требуются: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 3 | г. Минск, ул. Захарова, 104г (в гараже на 14 м/мест с инв. № 500/С-24097, общ. пл. 264 кв. м) | 16,45 | 20,56 | 2,5 | 73,04 | Любые цели, возможные на данных площадях | Гараж (бокс 27). Имеется проходная на территории. Отдельный вход. Санузел совместно с другими арендаторами. Имеются: электроснабжение, отопление. Требуются: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 4 | г. Минск, ул. Захарова, 104а (в гараже на 5 м/мест с инв. № 500/С-2920, общ. пл. 389 кв. м), г. Минск, ул. Захарова, 104е (в станции технического обслуживания с инв. № 500/С-24029, общ. пл. 124 кв. м) | 158,79 | 198,49 | 2,5 | 705,03 | Любые цели, возможные на данных площадях | В гараже на 5 м/мест: гаражи (7, 8), часть бойлерной (9), коридор, сан. узел. В станции технического обслуживания: гараж, парилка, 3 коридора, душевая, раздевалка. Имеется: электроснабжение, отопление, водопровод, канализация, ГВС от водонагревателей, санузел собственный. Требуется привести в соответствие с технической документацией |
| 5 | г. Минск, ул. Захарова, 104в (в административном здании с инв. № 500/С-24037, общ. пл. 320 кв. м) | 57,8 | 86,7 | 3 | 256,63 | Любые цели, возможные на данных площадях | Гараж (7). Имеется проходная на территории. Отдельный вход. Санузел совместно с другими арендаторами. Имеются: электроснабжение, отопление. Требуются: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 6 | г. Минск, ул. Захарова, 104в (в административном здании с инв. № 500/С-24037, общ. пл. 320 кв. м) | 35,92 | 53,88 | 3 | 159,48 | Административные цели (размещение персонала и пр.) | Кабинет (5) на 1-м этаже. Имеется проходная на территории. Санузел совместно с другими арендаторами. Имеются: электроснабжение, отопление. Требуется: установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 7 | г. Минск, ул. Захарова, 104в (в административном здании с инв. № 500/С-24037, общ. пл. 320 кв. м) | 15,08 | 22,62 | 3 | 66,96 | Административные цели (размещение персонала и пр.) | Кабинет (3) на 1-м этаже. Имеется проходная на территории. Санузел совместно с другими арендаторами. Имеются: электроснабжение, отопление. Требуется: установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 8 | г. Минск, ул. Захарова, 104в (в административном здании с инв. № 500/С-24037, общ. пл. 320 кв. м) | 121,7 | 182,55 | 3 | 540,35 | Административные цели (размещение персонала и пр.) | Кабинеты (1, 4, 5, 10, 11), кладовые (6, 7, 8), коридор (9) на 2-м этаже. Имеется проходная на территории. Санузел совместно с другими арендаторами. Имеются: электроснабжение, отопление. Требуется: установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 9 | г. Минск, ул. Промышленная, 9/2 (в здании специализированном складов с инв. № 500/С-5953, общ. пл. 202,8 кв. м) | 45,7 | 25,59 | 1,6 | 202,91 | Склад и иные цели, возможные на данных площадях | Склад 14. Отдельный вход. Имеется электроснабжение. Требуются: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 10 | г. Минск, ул. Промышленная, 9, здание проходной с инв. № 500/С-5951, общ. пл. 41,2 кв. м | 41,2 | 23,07 | 1,6 | 182,93 | Любые цели, возможные на данных площадях | Здание проходной полностью. Имеется электроснабжение. Требуются: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 11 | г. Минск, ул. Промышленная, 9/4, здание нежилое с инв. № 500/С-56343, общ. пл. 24,2 кв. м | 24,2 | 13,55 | 1,6 | 107,45 | Любые цели, возможные на данных площадях | Капитальное строение полностью. Имеется электроснабжение. Требуются: ремонт, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 12 | г. Минск, ул. Щорса 2-я, 5-46 Изолированное помещение (наименование – административное помещение) с инв. № 500/D-708035659, общ. пл. 225,3 кв. м | 225,3 | 152,08 | 1,5 | 1 000,33 | Любые цели, возможные на данных площадях | Изолированное помещение полностью в многоквартирном жилом доме. Имеются: электроснабжение, отопление, водоснабжение, канализация. Требуются: ремонт, установка прибора учета электроэнергии (тех. учет), установка прибора учета воды с дистанционным съемом показаний. Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 13 | г. Минск, ул. Гурского, 3А/1, 3А/2, здание склада-гаража с инв. № 500/С-46251, общ. пл. 199 кв. м и склад с инв. № 500/С-46253, общ. пл. 11,4 кв. м | 210,4 | 168,32 | 2 | 934,18 | Склад, гараж и иные цели, возможные на данных площадях | Капитальное строение (склад-гараж) полностью (199 кв. м) и капитальное строение (склад) полностью (11,4 кв. м). Имеется электроснабжение. Требуется: ремонт в обоих зданиях, кроме того в здании склада-гаража: ремонт кровли, а также замена (ремонт) сети электроснабжения внутри помещений, установка приборов учета электроэнергии (тех. учет). Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат |
| 14 | г. Минск, ул. Комсомольская, 11-2 (в изолированном административном помещении № 2 с инв. № 500/D-698981, общ. пл. 412,9 кв. м) | 221 | 331,50 | 3 | 981,24 | Административные цели (размещение персонала и пр.) | Изолированное помещение полностью. Имеется: электроснабжение, отопление, сан. узел на этаже общий. Требуется: ремонт. Все работы за счет арендатора без последующей компенсации затрат. Требуется привести в соответствие с технической документацией |

**Без учета коэффициента для отдельных видов деятельности (устанавливается при наличии оснований).*

**Базовая арендная величина составляет 17,76 бел. руб., размер базовой арендной величины ежегодно устанавливается Советом Министров Республики Беларусь с учетом изменения индекса потребительских цен за предыдущий год по отношению к предшествующему и применяется с 1 апреля года, в котором он установлен.*

В отношении лотов №№ 1–4, 9, 11, 12, 14 торги являются повторными.

Техническое улучшение помещений, а также текущий ремонт осуществляются за счет Арендатора и последующей компенсации не подлежат.

**Договоры аренды заключаются сроком на 3 (три) года.**

**Аукцион состоится 24 декбря 2024 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 (актовый зал).**

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, по 20 декабря 2024 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 17.00.**

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах:** организатора аукциона – **www.rlt.by;** Минского областного исполнительного комитета – **www.minsk-region.gov.by;** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
**КУП «Миноблавтосервис»** (Продавец)
на праве хозяйственного ведения.

Аукцион состоится **10.01.2025 г. в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

## Лот № 1: ПЕЖО БОКСЕР,

кузов (рама) № VF3YEDMFC11576690, Y3930300080034019.
Начальная цена с НДС 20 % – 28 808,16 руб.

**Место нахождения Лота № 1:**
г. Минск, ул. Петруся Бровки, 27.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» Организатора аукциона gostorg.by.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

**Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга»**
ИЗВЕЩАЕТ ОБ ОТМЕНЕ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2024.Ч.002.00131
по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/, принадлежащего ОАО «Витязь», назначенных на 11.12.2024 г. в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY), опубликованных 09.11.2024 г. в газете «Звязда», на сайте официальный сайт Витебского облисполкома http://vitebsk-region.gov.by/ru/ 06.11.2024.

**Конт. тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63.**

УНП 390477566

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении повторных электронных торгов по комбинированной схеме (на повышение и понижение цены недвижимого имущества) по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»** (Продавец) на праве собственности.

**Электронные торги проводятся 23.12.2024.**

## Лот № 1 в составе: Комплекс недвижимого и движимого имущества дома приезжих «Марьяливо», в том числе:

1. Объекты недвижимого имущества:
1.1. - Дом приезжих с инв. № 600/С-123927, 504,5 кв. м;
- Кабельные линии связи д.п. Марьяливо с инв. № 100000037051;
1.2. Здание гаража с инв. № 600/С-113906, 46,2 кв. м;
1.3. Наружные сети водопровода «Дома приезжих «Марьяливо» с инв. № 600/С-113970, 46,0 м;
1.4. Наружные сети канализации «Дома приезжих «Марьяливо» с инв. № 600/С-113967, 47,3 м;
1.5. Наружные сети электроснабжения «Дома приезжих «Марьяливо» с инв. № 600/С-113928, 26,8 м;
1.6. Котельная с инв. № 600/С-64619, 31,3 кв. м.
2. Объекты движимого имущества:
2.1. кондиционер «СПЛИТ» Mitsubishi, инв. № 100000036148;
2.2. котельное оборудование, инв. № 100000037059;
2.3. автоматическая система полива, инв. № 100000037061;
2.4. настенный кондиционер General, инв. № 100000037064;
2.5. настенный кондиционер General, инв. № 100000037065;
2.6. настенный кондиционер General, инв. № 100000037066;
2.7. напольный кондиционер General, инв. № 100000037067;
2.8. автоматическая система полива, инв. № 100000037068;
2.9. кухня «Василинка», инв. № 100000037134;
2.10. люстра, инв. № 100000037139;
2.11. комплект мебели для гардероба, инв. № 100000037142;
2.12. комплект нестандартной мебели, инв. № 100000037150;
2.13. вентиляционная установка, инв. 100000037138;
2.14. зеркало, инв. № 100000037135;
2.15. зеркало, инв. № 100000037136;
2.16. зеркало, инв. № 100000037137.
3. Товарно-материальные ценности:
3.1. жалюзи вертикальные 105*180, № 500000111083;
3.2. жалюзи вертикальные 175*195, № 500000111082;
3.3. жалюзи вертикальные 200*180, № 500000111084;
3.4. жалюзи вертикальные 256*195, № 500000111076;
3.5. жалюзи вертикальные 275*195, № 500000111078;
3.6. жалюзи вертикальные 290*180, № 500000111079;
3.7. жалюзи вертикальные 290*195, № 500000111081;
3.8. жалюзи вертикальные 324*195, № 500000111080;
3.9. жалюзи вертикальные Сандра, № 500000111077;
3.10. карниз для штор 22м, № 500000111014;
3.11. принадлежности каминные, № 500000110756;
3.12. камень для каменки жадеит колотый 10 кг, № 500000219048;
3.13. камень для каменки жадеит колотый набор 50 кг, № 500000219047;
3.14. камин электрический, № 500000033864;
3.15. панель варочная Bosch PUE611BB1E, № 500000410954;
3.16. панель мебельная, № 500000034884;
3.17. панель мебельная, № 500000034885;
3.18. тумба, № 500000034886;
3.19. шкаф, № 500000034888;
3.20. шкаф, № 500000034890;
3.21. шкаф духовой Bosch HBF134EB0R, № 500000414391;
3.22. зеркало, № 500000111087.

**Адрес:**
Минская обл., Минский р-н, Острошицко-Городокский с/с, д. Марьяливо; д. Марьяливо, пер. Высотный, 5; д. Марьяливо, пер. Высотный, 3.

**Земельный участок** 623685204101000526, площадью 0,2424 га.

**Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для обслуживания дома приезжих. Право постоянного пользования.

**Начальная цена с НДС 20 %** – 1 339 927,20 руб.
**Минимальная цена с НДС 20 %** – 1 071 941,76 руб.
**Задаток** – 133 993,00 руб.

**Шаг электронных торгов на повышение** – 5 % от начальной цены (66 996,36 руб.).

**Шаг электронных торгов на понижение** – 5 % от начальной цены (66 996,36 руб.).

**Срок для подписания договора купли-продажи:** 20 (двадцать) рабочих дней со дня проведения электронных торгов (после предъявления Продавцу платежного документа, подтверждающего оплату вознаграждения Организатора электронных торгов).

Порядок проведения электронных торгов, порядок регистрации на электронные торги определены Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке «GOSTORG» РУП «Институт недвижимости и оценки» (далее – ЭТП) и Правилами проведения электронных торгов по комбинированной схеме, размещенными на детальной странице лота на ЭТП.

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **18.12.2024 г. в 16.00.**

**Организатор электронных торгов: ☎ 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by.**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

# ПРАВАСУДДЗЕ АБО ПАЛІТЫЧНАЯ ГУЛЬНЯ?



## Рашэнні МКС і іх нікчэмнасць

**21 лістапада 2024 года Міжнародны крымінальны суд выдаў ордары на арышт прэм'ер-міністра Ізраіля Біньяміна Нетаньяху, ізраільскага міністра абароны Ёава Галанта, а таксама трох лідараў палесцінскай групоўкі ХАМАС. Цікава, гэтае рашэнне ў частцы, што датычыцца ізраільскіх палітыкаў, выклікала хвалю абурэння з боку ЗША і іх саюзнікаў, у той час як аналагічны крок адносна Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна ад 17 сакавіка 2023 года быў сустрэты з непрыхаваным адабрэннем і выкарыстаны для дыскрэдытацыі расійскага лідара.**

**Каб разабрацца ў сутнасці таго, што адбываецца, звернемся да гісторыі і разбяромся, што ўяўляе сабой Міжнародны крымінальны суд (МКС), а таксама прааналізуем вынікі яго дзейнасці.**

### ГІСТОРЫЯ СТВАРЭННЯ І КАМПЕТЭНЦЫІ АРГАНІЗАЦЫІ

Яшчэ ў 1948 годзе Генеральная Асамблея ААН у адной з рэзалюцый указвала на неабходнасць стварэння спецыяльнага юрыдычнага органа, які б на пастаяннай аснове займаўся крымінальным праследаваннем асоб, адказных за ўчыненне злачынстваў генацыду і іншых злачынстваў аналагічнай цяжкасці. Работа над гэтым пытаннем была даручана Камісіі міжнароднага права, якая прыйшла да высновы, што стварэнне такога органа з'яўляецца пажаданым і магчымым з пункту гледжання міжнароднага права. Аднак да адзінага меркавання прыйшлі толькі ў дачыненні да генацыду, злачынстваў супраць чалавечнасці і ваенных злачынстваў.

Ва ўмовах біпалярнага свету і абвастрэння халоднай вайны, калі лакальныя ўзброеныя канфлікты сталі прызнаным сродкам палітычнага супрацьстаяння, кансэнсусу ў вызначэнні паняцця «агрэсія» так і не было знойдзена. Гэта зрабіла немагчымым прыняцце рашэнняў у дадзенай галіне, а пытанне аб заснаванні міжнароднага крымінальнага суда не ўзнімалася аж да канца 90-х гадоў XX стагоддзя.

Толькі ў 1989 годзе па хадайніцтве ўрада Трынідада і Табага ААН аднавіла работу над пытаннем аб міжнародным крымінальным судзе, які валодае юрысдыкцыяй у дачыненні да злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркатычных сродкаў. Грамадзянская вайна 1991 года ў былой Югаславіі і генацыд у Руандзе 1994 года вымусілі Савет Бяспекі ААН вярнуцца да пытання стварэння незалежнага і пастаяннага міжнароднага крымінальнага суда.

На 52-й сесіі Генеральная Асамблея ААН па гэтым пытанні прыняла пастанову аб скліканні ў 1998 годзе пад эгідай арганізацыі Дыпламатычнай канферэнцыі ў Рыме. 17 ліпеня 1998 года 120 дзяржаў падпісалі Рымскі статут — прававую аснову для стварэння пастаяннага міжнароднага крымінальнага суда (МКС). Ён афіцыйна пачаў сваю дзейнасць з 1 ліпеня 2002 года, пасля ўступлення Рымскага статута ў сілу і яго ратыфікацыі 60 краінамі свету.

МКС стаў першым пастаянна дзейным міжнародным органам крымінальнай юстыцыі (г. Гаага), у кампетэнцыю якога ўваходзіць праследаванне асоб, адказных за генацыд, ваенныя злачынствы, злачынствы супраць чалавечнасці, а таксама злачынствы агрэсіі (з 2010 г.). Ён не ўваходзіць у афіцыйныя структуры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, хоць можа заводзіць справы па прадстаўленні Савета Бяспекі ААН.

### ВЫНІКІ ДЗЕЙНАСЦІ МКС

На працягу дастаткова доўгага перыяду часу асноўнымі фігурантамі крымінальных спраў МКС з'яўляліся прадстаўнікі афрыканскіх дзяржаў. Згодна з афіцыйнай статыстыкай, у суд былі пададзены скаргі аб меркаваных злачынствах у 138 краінах. Аднак расследаванне заводзілася толькі ў дачыненні да васьмі сітуацый у Афрыцы: у Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга, Угандзе, Цэнтральна-афрыканскай Рэспубліцы; у суданскім рэгіёне Дарфур; Кеніі, Лівіі, Кот-д'Івуары і Малі.

Толькі ў 2006 годзе пачаўся разгляд судом канкрэтных спраў. 17 сакавіка 2006-га быў арыштаваны і аддадзены Міжнароднаму крымінальнаму суду грамадзянін Дэмакратычнай Рэспублікі Конга Томас Лубангу Д'іла, лідар «Саюза кангалезскіх патрыётаў», удзельнік ітурыйскага канфлікту. Ён быў абвінавачаны ў прызыве на вайсковую службу дзяцей ва ўзросце да 15 гадоў і выкарыстанні іх у ваенных дзеяннях. Суд пачаўся 26 студзеня 2009 года. 14 сакавіка 2012-га Лубанга быў прызнаны вінаватым па прад'яўленых яму абвінавачаннях і асуджаны да 14 гадоў пазбаўлення волі. Гэта быў першы абвінаваўчы вердыкт МКС.

Найбольш рэзанансных рашэннямі МКС у перыяд 2006—2022 гадоў трэба лічыць выдачу ордараў на арышт прэзідэнта Судана Амара аль-Башыра ў 2006-м, лідара Лівіі М. Кадафі (2011), былога прэзідэнта Кот-д'Івуара Ларана Гбагбо (2013). Гэта не перашкодзіла першаму выконваць абавязкі прэзідэнта да 2019 года, а Лізе арабскіх дзяржаў ігнараваць ордар МКС. У сваю чаргу Ларан Гбагбо быў цалкам апраўданы ў 2019-м.

Нарэшце 12 красавіка 2019 года МКС адмовіўся расследаваць дзеянні амерыканскіх вайскоўцаў у Афганістане, хоць у наяўнасці былі ўсе элементы «злачыннай агрэсіі».

Па сутнасці, гэта ўсе дасягненні МКС за ўвесь перыяд яго функцыянавання да 2022 года. Міжнародная бюракратычная арганізацыя, якая існуе выключна для іміджавай неабходнасці, рашэнні якой не абавязковыя для выканання і часта проста ігнаруюцца суверэннымі дзяржавамі. Увесь яе апарат здолеў «расследаваць» толькі каля трох дзясяткаў крымінальных спраў, па большай частцы якіх былі вынесены апраўдальныя прыгаворы.

Больш за тое, шэраг краін прынцыпова пярэчыць самой ідэі МКС як структуры, якая абмяжоўвае суверэнітэт дзяржаў і дае нявызначана шырокія кампетэнцыі суду. Сярод іх — ЗША, Кітай, Індыя, Ізраіль і Іран.

Гістарычна самым заўзятым праціўнікам дзейнасці МКС з'яўляліся ЗША. Вашынгтон хоць і падпісаў Рымскі статут у 2000 годзе, але ўжо ў 2002-м адклікаў свой подпіс. Першапачаткова Біл Клінтан, падпісваючы дакумент, растлумачыў, што «ЗША не збіраюцца ратыфікаваць Рымскі статут, пакуль у поўнай меры на свае вочы не азнаёмяцца з работай Міжнароднага крымінальнага суда».

Ва ўласных інтарэсах Вашынгтон цалкам адмовіўся ад удзелу ў Рымскім статуце, назваўшы яго парушаючым нацыянальныя інтарэсы і суверэнітэт ЗША. Акрамя таго, у 2002 годзе быў прыняты спецыяльны Закон аб абароне амерыканскіх вайскоўцаў, які дазволіў прымяненне ваеннай сілы для вызвалення любога амерыканскага грамадзяніна або грамадзян з ліку саюзнікаў ЗША, затрыманых на тэрыторыі якой-небудзь дзяржавы па ордары МКС. ЗША заключылі таксама двухбаковыя пагадненні з шэрагам краін, у якіх абавязалі іх не выдаваць падазраваных амерыканскіх грамадзян Міжнароднаму крымінальнаму суду, а ў выпадку парушэння гэтых дамоўленасцей ЗША спыняць аказанне ім ваеннай дапамогі і любой іншай падтрымкі.

Адміністрацыя прэзідэнта Д. Трампа пагражала ўвядзеннем персанальных санкцый у дачыненні да работнікаў МКС у адказ на расследаванні супраць амерыканскіх грамадзян, звязаных з магчымымі ваеннымі злачынствамі ў Афганістане. ЗША былі гатовы ўвесці санкцыі супраць любога грамадзяніна ўсіх 120 краін Рымскага статута, які будзе заўважаны ва ўдзеле ў расследаванні.

Сярод постсавецкіх краін падпісалі Рымскі статут, але не ратыфікавалі яго Узбекістан, Кіргізія, Расія, не падпісалі Беларусь, Азербайджан, Казахстан і Туркменістан. Расія ў далейшым адклікала свой подпіс.

Да пачатку трэцяга дзесяцігоддзя XXI стагоддзя пра МКС як міжнародную арганізацыю ўвогуле пачалі забываць. Яе дзейнасць асабліва нікому не замінала і ні на што не ўплывала. Тым больш што сусветныя лідары ігнаравалі работу ў дадзеным фармаце і паслядоўна вырашалі ўласныя геапалітычныя задачы.

### ПРАВАСУДДЗЕ ЦІ ПАЛІТЫЧНАЯ ГУЛЬНЯ?

Нікому не патрэбная бюракратычная арганізацыя, якая ціхенька «памірала», гучна заявіла аб сабе ў 2023 годзе, калі 17 сакавіка выдала ордар на арышт Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна і Марыі Львовай-Бяловай, упаўнаважанай РФ па правах дзіцяці. Гэтая «навіна» была распіярана ўсімі заходнімі СМІ, а МКС стаў героем дня і «абаронцам дэмакратыі». Далей болей.

У сярэдзіне верасня 2023 года Еўрапарламент заклікаў МКС выдаць ордар на арышт беларускага Прэзідэнта. Еўрапейскія функцыянеры з падачы нашых збеглых палічылі яго датычным «да гвалтоўнай дэпартацыі ўкраінскіх дзяцей з тэрыторый, часова акупаваных расійскімі войскамі, у так званыя «аздараўленчыя лагеры», дзе іх падвяргаюць прымусовай русіфікацыі». Паводле звестак, пазначаных у рэзалюцыі, у Беларусь былі дастаўлены больш як 2150 дзяцей. Сапраўды, бязглуздзіца на мяжы фантастыкі, але якая трансліруецца «светачамі дэмакратыі».

У функцыянераў МКС хапіла розуму не разглядаць гэты фэйк, аднак супраць волі сваіх галоўных спонсараў — Еўропы пальцы здолелі недалёка. 5 сакавіка 2024 года ордары на арышт выдадзены на імя С. І. Кабылаша і В. М. Сакалова, камандуючых Ваенна-паветранымі сіламі і Чарнаморскім флотам Расіі адпаведна. А 24 чэрвеня 2024-га аналагічныя «фількіны граматы» выпісаны на імя С. К. Шайгу і В. В. Герасімава — міністра абароны і начальніка Генеральнага штаба Расіі.

Адносна службовых асоб дзяржаў, якія не ратыфікавалі пагадненне, любыя рашэнні МКС нікчэмныя, як адзначаюць юрысты-міжнароднікі. Аднак ва ўмовах гарачай фазы пераўладкавання свету любыя спосабы прымальныя. Інфармацыйная нагода, магчымасць паразглагольстваваць у СМІ, выкарыстаць ордар для палітычнай ізаляцыі і проста знясławіць чалавека — усё гэта дапушчальна, калі разбураецца твой дабрабыт. І няважна, як ты сам ставішся да МКС, важна, што сёння ён карысны для вырашэння ўласных задач.

На гэтым фоне ордары на арышт Біньяміна Нетаньяху і Ёава Галанта, якія выклікалі буру абурэння ў Ізраілі і сярод істэблішменту ЗША, могуць разглядацца як шматхадовая аперацыя па захаванні сённяшняга ізраільскага ўрада. Калі ў выпадку з Расіяй рашаецца прамая задача — ЗША заклікаюць да правядзення расследавання і прад'яўлення абвінавачанняў, то ў адносінах да Ізраіля гаворка ідзе аб аперацыі прыкрыцця ў інтарэсах амерыканскага сатэліта.

Ужо сёння большасць палітычных аналітыкаў сыходзяцца ў меркаванні: нягледзячы на жорсткую крытыку з боку Біньяміна Нетаньяху, МКС сваімі дзеяннямі фактычна выратаваў ізраільскага прэм'ера, які зведвае каласальны знешні і ўнутраны ціск. Калі здавалася, што дні знаходжання Нетаньяху ва ўладзе практычна злічаныя, Міжнародны крымінальны суд прыйшоў яму на дапамогу.

Ваенны кабінет, створаны пасля нападзення ХАМАСа, апошнім часам апынуўся на мяжы развалу — літаральна днямі былы міністр абароны і адзін з апанентаў Нетаньяху Бені Ганц прыгразіў выйсці з яго складу, калі прэм'ер не прадставіць дакладны пасляваенны план кіравання Газай, чаго Нетаньяху рабіць вельмі не хацеў. Цяпер жа бунт Ганца, відаць, адышоў на другі план.

Вось, аказваецца, навошта быў патрэбны МКС, гэты незразумелы орган, які два дзесяцігоддзі не мог знайсці сабе работу, добрасумленна асвойваючы немалыя фінансавыя бюджэты краін-падпісантаў.

Тое, што МКС — гэта бескарысная арганізацыя, Беларусь усвядоміла дзесяцігоддзі таму, адмовіўшыся падпісаць Рымскі статут. Час паказаў, што мы мелі рацыю, а гэты «высокі суд» проста чарговы бюракратычны арганізм, які дзейнічае ў інтарэсах гаспадароў «свету, заснаванага на правілах». Ён нічога не вырашае, не здольны абараніць праўду, а спрабуе дыктаваць «уласную волю» суверэнным дзяржавам і іх кіраўнікам.

Жыць сваім розумам, трымаць слова і захоўваць свет, працаваць на карысць сваёй краіны і яе грамадзян — у гэтым сутнасць нашай палітыкі, якая рэалізоўваецца Прэзідэнтам. Сёння нас чуюць і падтрымліваюць усё большая колькасць краін і народаў, якія хочуць справядлівасці, шануюць уласны суверэнітэт і гатовы будаваць новы свет, заснаваны на павазе нацыянальных інтарэсаў дзяржаў.

**Мікалай БУЗІН,**
**старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў, прафесар.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Германіі распрацоўваюць план пашырэння сеткі бамбасховішчаў




У Германіі адзначаецца недахоп агульнадаступных бамбасховішчаў — іх налічваецца 579, дзе могуць размясціцца менш за 500 тысяч чалавек, у той час як у краіне пражываюць каля 83 млн чалавек, паведаміла газета Bild. Паводле ацэнкі кіраўніка Федэральнага ведамства па абароне насельніцтва і ліквідацыі наступстваў стыхійных бедстваў (ВВК) Ральфа Тыслера, на будаўніцтва сеткі бункераў спатрэбіцца вялікая колькасць часу. На гэтым фоне ВВК сумесна з уладамі федэральных земляў працуе над нацыянальным планам па пашырэнні сеткі бамбасховішчаў. Згодна з ім, у якасці ахоўных збудаванняў для грамадзянскага насельніцтва будуць выкарыстоўвацца ўсе прыдатныя для гэтых мэт грамадскія месцы (станцыі метро, цэнтры абслугоўвання насельніцтва, адміністрацыйныя будынкі), а таксама прыватныя дамы.

### Байдэн аб'явіў аб памілаванні свайго сына па дзвюх судовых справах



Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн падпісаў памілаванне свайго сына Хантэра па дзвюх судовых справах, паведаміла ТАСС. Пры гэтым амерыканскі лідар падкрэсліваў, што «з першага дня на сваёй пасадзе казаў, што не будзе ўмешвацца ў прыняцце рашэнняў Міністэрствам юстыцыі ЗША». Паводле яго ацэнкі, стрымаў гэтае слова, «нават калі назіраў за тым, як сын падвяргаецца выбарачнаму і несправядліваму пераследу». Член Палаты прадстаўнікоў Кангрэса ЗША Марджары Тэйлар-Грын (рэспубліканка ад штата Джорджыя) лічыць, што Байдэн, памілаваўшы свайго сына, прызнаў, што той фактычна з'яўляецца злачынцам. Афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава назвала рашэнне амерыканскага лідара карыкатурай на дэмакратыю. Прадпрымальнік Ілан Маск палічыў, што гэтае рашэнне можа негатыўна адбіцца на цэласнасці Злучаных Штатаў.

### У Японіі злавілі мядзведзя, які забраўся ў супермаркет



Гэта адбылося ў адным з паўночных гарадоў краіны, паведаміла японскае грамадскае тэлебачанне. Па даных крыніцы, мядзведзь зайшоў у супермаркет, дзе напаў на аднаго з супрацоўнікаў і траўміраваў яго. Мужчына змог пазбегнуць сур'ёзных раненняў, таму яго жыццю нічога не пагражае. Мядзведзя ўдалося злавіць на трэція суткі дзякуючы сетцы сэнсарных пастак, расстаўленых на тэрыторыі супермаркета. Лясныя госці нярэдка наведваюць у насельніцтва пункты Японіі, асабліва ў гарады каля лясной і гарыстай мясцовасці. Напрыклад, толькі ў Акіце за апошні месяц мядзведзяў некалькі разоў бачылі ў жылых кварталах. Улады ўвесь час заклікаюць жыхароў быць пільнымі.

# ЗНАЙСЦІ СЯБЕ

## Як людзі з інваліднасцю робяць свет лепшым

**ЖЫЦЦЁ часам зводзіць з незвычайнымі людзьмі, якія выклікаюць шчырае захапленне. Мне давялося пазнаёміцца з маці траіх дзяцей, якая па выхадных на бясплатнай аснове з уласных прадуктаў пячэ найсмачнейшыя булачкі (амаль у прамысловых маштабах) для сацыяльнай сталовай, дзе кормяць бяздомных. Акрамя таго, яна актыўна ўдзельнічае ў рабоце бацькоўскага камітэта школы, дзе вучацца яе дзеці, і піша карціны. Пры гэтым атрымлівае другую вышэйшую адукацыю, а працуе — у сферы IT. Як яна ўсё паспявае, дзівілася я.**

Паколькі размаўлялі мы спачатку ў месенджарах і па тэлефоне, доўгі час я не ведала, што мая знаёмая перамяшчаецца ў інваліднай калясцы... Дык вось, пры асабістай сустрэчы яна распавяла: тыя, у каго ёсць інваліднасць, звычайна не любяць славесную формулу «людзі з абмежаванымі магчымасцямі». Бо абмежаванні для сваіх магчымасцяў кожны з нас устанаўлівае сам. І сам для сябе можа вырашыць, што яго магчымасці — бязмежныя. Асабліва калі побач знойдуцца тыя, хто падтрымае ў гэтым рашэнні.

Першая рэспубліканская выстаўка-продаж «Тварэнні сэрцаў» адбылася ў Мінску ў мінулыя выхадныя. З 29 лістапада да 1 снежня ў «Першым нацыянальным гандлёвым доме» тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і сацыяльныя пансіянаты ўсіх абласцей Беларусі і Мінска прадставілі наведвальнікам аднаго з найбуйнейшых гандлёвых цэнтраў сталіцы творчыя работы і значныя праекты сваіх таленавітых і крэатыўных падапечных.

### Цікавасць да жыцця плюс натхненне

Крысціна — маладая, сімпатычная дзяўчына. Жыве яна ў невялікім гарадку Старыя Дарогі, а перасоўваецца — у інваліднай калясцы. Але ад многіх яе аднагодкаў дзяўчыну адрознівае не гэта, а мэтанакіраванасць, шматграннасць інтарэсаў і неабыякавасць. На пляцоўцы форуму «Тварэнні сэрцаў» Крысціна Жукавец прадставіла майстар-клас па роспісе імбірных пернікаў. Хоць кандытарская справа — далёка не адзінае яе захапленне.

— Захапляюся выпечкай, займаюся эпаксіднай смалой, стваряю карціны з нітак і складаю фудбукеты, — пералічвае Крысціна. — Люблю ствараць брошкі і іншыя ўпрыгожванні з гіпсу. У апошні час падабаецца алмазны жывапіс: прадумваю ўласныя арт-праекты і ўвасабляю іх у жыццё.

У творчасці Крысціны ўжо ёсць свае аматары, якія нязменна купляюць яе работы. Але галоўнай справай жыцця дзяўчына лічыць дабрачыннасць. Яна — кіраўнік дабрачыннага праекта «Майстэрня добрых спраў».

— У нашай майстэрні — майстры з усёй Беларусі: ІП, рамеснікі, самазанятыя, — кажа яна. — Вы можаце размясціць свае работы ў нашай майстэрні, і 10 % з кожнага продажу будзе пералічвацца на дабрачыннасць. Таксама ў нас ёсць платформа ў «Інстаграме» і бяспройгрышная латарэя «Бумеранг» — у ёй можа паўдзельнічаць як дабрачынец ці як валанцёр.

Задача праекта — збор сродкаў дзецям на дарагое лячэнне, тлумачыць суразмоўніца. Як нарадзілася такая ідэя? І ў цэлым адкуль бяруцца людзі, для якіх чужое гора — сваё?

— Калісьці дапамагалі мне, — кажа Крысціна. — Збіралі грошы на лячэнне. Я ведаю, як гэта няпроста. Кожны рубель важны, і пры гэтым быццам бы ніякавата прасіць у кагосьці, бо ў цябе (па мерках здаровых людзей) усё ёсць. Але вось менавіта на лячэнне — не хапае. Словам, прасіць вельмі цяжка. Хачу аддаць належнае мамам такіх дзяцей: яны гатовыя пайсці на ўсё, каб іх дзіцяці стала лягчэй... Так і нарадзіўся гэты дабрачынны праект. З жадання дапамагчы дзецям і падтрымаць іх бацькоў.

Дзяўчына тлумачыць, што ўсё паспяваць — нескладана, калі ёсць цікавасць да жыцця і натхненне.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**Арганізатары выстаўкі-продажу «Тварэнні сэрцаў» хацелі паказаць, наколькі людзі з інваліднасцю могуць быць творчымі і здольнымі на тое, што далёка не кожнаму пад сілу.**

— Творчы чалавек працуе, толькі калі ёсць натхненне. Я заўсёды гавару: у кожнай рабоце, створанай майстэрам, жыве яго душа. Нашы работы — жывыя, з энергетыкай любові і дабра. І нават маленькая рэч, набытая ўдзельнікам дабрачыннай латарэі, будзе нагадваць: вы зрабілі вялікую добрую справу. Вы дапамаглі дзіцяці, і, магчыма, менавіта ваш рубель закрыў збор — а значыць, дзіця будзе жыць. Нядаўна мы закрылі збор для Фадзея, цяпер на выставе «Тварэнні сэрцаў» збіраем грошы для Каці. І для нас кожны раз велізарнае шчасце даведвацца, што дзіця будзе здаровае.

### Не замыкацца ў сваім маленькім свеце...

— У многіх нашых грамадзян складваецца ўражанне, што чалавек з інваліднасцю — гэта той, хто мае патрэбу ў пастаяннай апецы, хто несамастойны, — адзначае **старшыня Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінгарвыканкама Пётр ШУЦЬКО.** — Арганізуючы гэтае мерапрыемства, мы хацелі паказаць, наколькі гэта людзі развітыя і творчыя. Пры стварэнні пэўных умоў яны здольныя на тое, што далёка не кожнаму пад сілу. Выстаўка прадставіла мастацкія вырабы, створаныя рукамі падапечных тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльных пансіянатаў. Гэтыя людзі маюць сур'ёзныя захворванні, у большасці з іх няма спецыяльнай адукацыі. І ўсё ж яны здолелі раскрыць свой творчы патэнцыял і робяць прыгажосць, якой гатовы падзяліцца.

Важна, каб чалавек, які мае праблемы са здароўем, не замыкаўся ў сценах сваёй кватэры, у сваім маленькім свеце, а жыў паўнавартасным жыццём, адзначае Пётр Шуцько. На гэта і накіравана работа спецыялістаў пансіянатаў і тэрытарыяльных цэнтраў. Апошніх толькі ў сталіцы — дзесяць, і сёння яны актыўна асвойваюць самыя розныя формы работы.

— Развіваем валанцёрства ў кірунку «роўны дапамагае роўнаму». Валанцёрскай працай займаюцца ў такіх цэнтрах і людзі, у якіх пасля выхаду на пенсію дастаткова вольнага часу, — кажа Пётр Леанідавіч. — Актыўна ў гэтым удзельнічаюць аддзяленні для пажылых грамадзян. Прычым ініцыятыву і жаданне праводзіць валанцёрскую працу з моладдзю ў нашых цэнтрах праяўляюць нават людзі вельмі шаноўнага ўзросту. Многія з іх раней працавалі ў сферы адукацыі або культуры, маюць педагагічныя навыкі. Свае веды і вопыт яны гатовы дарыць тым, хто мае ў гэтым патрэбу. І гэта дае імпульс усёй нашай рабоце.

### Прастора магчымасцяў

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 24.10.2024 г.**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **16.12.2024 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **13.12.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

---

## Извещение о проведении **15 января 2025 года** торгов на право размещения средств рекламы в лифтах многоквартирных жилых домов, расположенных в г. Минске

| № предмета торгов | Место размещения средства рекламы (согласно поадресной инвентаризации лифтов*) | Вид средства рекламы (согласно техническому заданию) | Размер средств рекламы | Площадь рекламного поля, кв. м | Количество средств рекламы, единиц | Начальная цена предмета торгов (с учетом НДС) / сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Уполномоченное лицо по управлению общим имуществом совместного домовладения – **коммунальное унитарное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство №1 Московского района г. Минска»**, г. Минск, ул. Гурского, дом 26, тел. (017) 374-91-76 | | | | | | |
| 1 | Лифтовые кабины жилых домов, расположенные в Московском районе г. Минска | Антивандальный стенд (лифтборд) – 2 175 шт. | 594*420 мм (А2) – в лифтах грузоподъемностью до 400 кг | 0,25 | 2 040 | 22 559,20 |
| | | | 630*594 мм (6 А4) в лифтах грузоподъемностью от 400 до 630 кг | 0,37 | 104 | |
| | | | 841*594 мм (А1) в лифтах грузоподъемностью 630 кг и выше | 0,50 | 31 | |
| Уполномоченное лицо по управлению общим имуществом совместного домовладения – **коммунальное унитарное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство Октябрьского района г. Минска»**, г. Минск, ул. Могилевская, д. 2, корп. 2, тел. (017) 357-74-57 | | | | | | |
| 2 | Лифтовые кабины жилых домов, расположенные в Октябрьском районе г. Минска | Антивандальный стенд (лифтборд) – 1 026 шт. | 594*420 мм (А2) – в лифтах грузоподъемностью до 400 кг | 0,25 | 953 | 13 447,73 |
| | | | 630*594 мм (6 А4) в лифтах грузоподъемностью от 400 до 630 кг | 0,37 | 61 | |
| | | | 841*594 мм (А1) в лифтах грузоподъемностью 630 кг и выше | 0,50 | 12 | |
| Уполномоченное лицо по управлению общим имуществом совместного домовладения – **коммунальное унитарное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство Заводского района г. Минска»**, г. Минск, пер. Бехтерева, д. 6, тел. (029) 766-11-18 | | | | | | |
| 3 | Лифтовые кабины жилых домов, расположенные в Заводском районе г. Минска | Антивандальный стенд (лифтборд) – 1 240 шт. | 594*420 мм (А2) – в лифтах грузоподъемностью до 400 кг | 0,25 | 1 141 | 15 568,80 |
| | | | 630*594 мм (6 А4) в лифтах грузоподъемностью от 400 до 630 кг | 0,37 | 80 | |
| | | | 841*594 мм (А1) в лифтах грузоподъемностью 630 кг и выше | 0,50 | 19 | |
| Уполномоченное лицо по управлению общим имуществом совместного домовладения – **коммунальное унитарное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство Советского района г. Минска»**, г. Минск, ул. Смолячкова, дом 16, тел. (029) 345-65-66 | | | | | | |
| 4 | Лифтовые кабины жилых домов, расположенные в Советском районе г. Минска | Антивандальный стенд (лифтборд) – 984 шт. | 594*420 мм (А2) – в лифтах грузоподъемностью до 400 кг | 0,25 | 921 | 12 779,42 |
| | | | 630*594 мм (6 А4) в лифтах грузоподъемностью от 400 до 630 кг | 0,37 | 63 | |
| | | | 841*594 мм (А1) в лифтах грузоподъемностью 630 кг и выше | 0,50 | 0 | |
| Уполномоченное лицо по управлению общим имуществом совместного домовладения – **коммунальное унитарное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство Партизанского района г. Минска»**, г. Минск, ул. Стахановская, д. 37, пом. 2Н, тел. (017) 270-93-37 | | | | | | |
| 5 | Лифтовые кабины жилых домов, расположенные в Партизанском районе г. Минска | Антивандальный стенд (лифтборд) – 338 шт. | 594*420 мм (А2) – в лифтах грузоподъемностью до 400 кг | 0,25 | 310 | 4 526,42 |
| | | | 630*594 мм (6 А4) в лифтах грузоподъемностью от 400 до 630 кг | 0,37 | 13 | |
| | | | 841*594 мм (А1) в лифтах грузоподъемностью 630 кг и выше | 0,50 | 15 | |

**Срок действия договора – 1 год** со дня подписания его сторонами без права продления.

**Организатор торгов** – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 360-42-22.

**Форма проведения торгов** – аукцион на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов на право размещения средств рекламы в лифтах многоквартирных жилых домов, утвержденным организатором торгов.

Аукционные торги проводятся **15 января 2025 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, зал аукционов (каб. 7).

Документы на участие в торгах принимаются с 03.12.2024 **по 13.01.2025** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток (задатки) и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в торгах;
- копию платежного документа о внесении суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов торгов задаток вносится по каждому из предметов торгов);
- копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в торгах.

Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена по соответствующему предмету торгов не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583 (назначение платежа – задаток для участия в торгах на право размещения средств рекламы, назначенных на 15.01.2025 по предмету торгов №__).

Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения представляются:

физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность;

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом торгов организатор торгов проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в торгах. Заключительная регистрация представляет собой замену билетов участников торгов на аукционные номера, под которыми участники торгов будут участвовать в торгах. После проведения торгов участники обязаны вернуть эти номера организатору торгов.

**Порядок определения победителя торгов:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

**Иные условия торгов:**

Победитель торгов (единственный участник торгов) обязан:

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** оплатить вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов;
- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** перечислить на расчетный счет уполномоченного лица по управлению общим имуществом совместного домовладения сумму средств, за которую продан предмет торгов за вычетом внесенной суммы задатка (цена продажи предмета торгов – стоимость услуг уполномоченного лица по управлению общим имуществом совместного домовладения по размещению рекламы в лифтах многоквартирных жилых домов, определенная по итогам торгов и уплачиваемая ежемесячно в соответствии с договором на оказании услуг по размещению рекламы);
- **в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов** заключить договор на оказание услуг по размещению рекламы с уполномоченным лицом по управлению общим имуществом совместного домовладения (при условии внесения платы за предмет торгов и перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов).

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) их победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

**Телефон для справок** (017) 360-42-22 – отдел аукционов (по вопросам организации и проведения торгов).

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления – Аукционы»).

Дополнительная информация и поадресная инвентаризация лифтов* размещены на сайте организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции/Файлы).

Успамінаючы Максіма Лужаніна

# «ДЗЕСЬЦІ ПТУШКА ШЧАБЯТНУЛА, ДЗЕСЬЦІ Я Ў ДОБРАЕ ЖЫТА ЗАЙШОЎ...»

**У вядомым фантастычным серыяле «Доктар Хто» ёсць злавесныя іншапланецяне, каменныя анёлы, у прысутнасці якіх ты можаш ратавацца толькі адным: утаропіцца ў іх і не міргаць. Бо варта міргнуць — наблізяцца... І адкінуць цябе ў мінулае.**

**Так часам успрымаюцца тэмпы развіцця сённяшніх тэхналогій: міргнуў — замест дыскет лазерныя дыскі, міргнуў — ужо флэшкі... А плёначных касет, на якія запісваў гутаркі, дыскусіі, прэсканферэнцыі верны дыктафон, цэлыя скрынкі... Здавалася, вось яна, занатаваная памяць! Аж не — і касеты тыя псуюцца, і тэхніка, на якой іх можна праслухаць, таксама... І вось ужо ляжаць тыя мае журналісцкія скарбы нямыя, і галасы на іх мярцвеюць. Сярод тых касет асабліва непакоіла тая, на якой пазнака — «Лужанін». Максім Лужанін, ён жа Аляксандр Амвросьевіч Каратай, адзін з «маладнякоўцаў» і «ўзвышэнцаў», сведка далёкіх трагічных падзей, які прайшоў і рэпрэсіі 1930-х з сібірскай высылкай, і фронт Вялікай Айчыннай вайны, які доўгія гады быў асабістым сакратаром Якуба Коласа...**



Гэтай восенню Максіму Лужаніну адзначаецца 115 гадоў. Мы часта наведвалі яго ў апошнія гады яго жыцця. Абавязкова былі на яго дні народзінаў — а так сталася, што нарадзіўся паэт 2 лістапада, якраз на восеньскія Дзяды. Жонка яго, паэтка Яўгенія Пфляўмбаўм, — 1 лістапада, а Якуб Колас — 3-га, і Аляксандр Амвросьевіч неаднойчы ўспамінаў, як разам з сям'ёй Коласа усе тры даты адзначалі разам, то ў адным доме, то ў другім...

З Яўгеніяй Пфляўмбаўм таксама давялося сустрэцца — уласна кажучы, я і трапіла ў іх кватэру з відам на Свіслач і парк Горкага, калі прыйшла ладзіць гутарку з Яўгеніяй Эргардаўнай, якую пасля дзесяцігоддзяў маўчання раптам адкрылі як паэтку — пасля першага зборніка, выдадзенага ў 1920-х, пісала ў стол... Пфляўмбаўм тады ўжо перанесла інсульт, на пытанні мае адказваць сама амаль не магла, дапамагаў муж — ён жа і падпісаў ад яе імя ейную кніжачку...

А я толькі пасля смерці абодвух прачытала іх ліставанне ў маладосці, ужо ў апрацаваных публікацыях — якія жарсці, які высокі слог... Каханне вясковага хлопца да былой гімназісткі стала для яго яшчэ адным выклікам, матывацыяй да ўнутранага развіцця. Максім Лужанін быў адным з найлепшых беларускіх стылістаў. Дарэчы, нядаўна ўсплыў цікавы для мяне факт, што пасля дэмабілізацыі ў 1944 годзе, калі Лужаніна цяжка параніла ў бітве пад Сталінградам, ён нейкі час загадваў аддзелам культуры ў рэдакцыі газеты «Звязда» — гэта значыць, восемдзесят гадоў таму быў маім папярэднікам на пасадзе...

Вядома, не ўсё ён нам расказваў, не пра ўсё ўдавалася распытаць... Але размаўляць заўсёды было надзвычай цікава. Запіс на касеце відавочна меў каштоўнасць і калі ўдалося знайсці касетны дыктафон, які працуе — гэта пацвердзілася. Дзесь у канцы 1990-х мы вырашылі запісаць дыскусію з удзелам Максіма Лужаніна: пагаварыць, скажам, пра сувязь пакаленняў, пераемнасць традыцый у беларускай літаратуры... Зразумела, размова зайшла і пра ўсялякае іншае. Сядзелі мы тады, наколькі памятаю, гадзіны тры, пакуль гаспадар не стаміўся ўшчэнт. Шмат было эмоцый і цікавінак... На касеце, якая захавалася праз трыццаць гадоў, на жаль, толькі завяршэнне нашай размовы... Не ведаю, ці маюцца дзе яшчэ касеты ад таго дня, але з нагоды юбілею Максіма Лужаніна выдатная падстава прыцтаваць нешта з таго, што ўдалося расчуць са старога запісу.

## ПРА АДНАЎЛЕННЕ НЕНАПІСАНЫХ ВЕРШАЎ

Рукапісаў бачыла ў доме шмат... Цэлыя чамаданы. Пасля смерці жонкі часта заставала Максіма Лужаніна за разборам яе чарнавікоў — у нататніках, на асобных аркушыках, гарой на стале... Было і шмат яго ўласных аркушыкаў, нататнікаў, сшыткаў. Памятаю, размова зайшла пра тое, што верш — гэта злепак нейкага імгнення, пэўнага стану паэта, і паўтарыць яго немагчыма. Вось што сказаў Аляксандр Амвросьевіч:

*«Я ў розныя часы запісваў пачатак верша, запісваў і хаваў... Запісваў, пакуль не заканчвалася папера, і адкладаў. І ў мяне такіх пачаткаў цэлы чамадан, які ездзіў са мной у многія дарогі. Тое-сёе «распісвалася». Па гэтым кавалачку паперы магу аднавіць абставіны, што мяне ўразілі, успомніць напружанне невялікае. Дзесьці птушка шчабятнула, дзесьці я ў добрае жыта зайшоў, баравік падняў... Гэтая паперка дасць мне магчымасць увайсці ў той самы стан. Але, на жаль, гэты чамадан застаўся на пяцьдзясят працэнтаў нерэалізаваны. Стаіць замкнуты, хоць я ні ў якую ўжо дарогу, апрача апошняй, не збіраюся... Але майце на ўвазе, што аднавіць можна — не па Станіслаўскаму, а па Чэхаву. Аднаўленне душэўнага імпульсу. Імпульс, не толькі рух, як у Станіслаўскага».*

Тут Аляксандр Амвросьевіч згадвае дзве школы акцёрскага майстэрства — Станіслаўскага і Міхаіла Чэхава. Міхаіл Чэхаў сцвярджаў, што для акцёра галоўнае — адчуць і аднавіць атмасферу, у якой дзейнічае герой, эмацыянальную ўнутраную афарбоўку. Так, Лужанін вельмі шмат ведаў, да апошняга нешта чытаў, намагаўся спазнаць штосьці новае. Памятаю, у адзін з маіх візітаў незадоўга да яго смерці сядзім за сталом, ён задумліва разважае — колькі ж таямніц хавае само чалавечае цела! Кратае сябе за вуха: вось жа звычайнае вуха... А як яно хітра зладжана! Гэта ж ніякая навука да канца не спазнае!

## ПРА РАННЮЮ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНУЮ ПАЭЗІЮ ЛУЖАНІНА І ПРАЗРЫСТУЮ ПАЭЗІЮ КОЛАСА

Гаворка зайшла пра той час, калі Максім Лужанін працаваў асабістым сакратаром Якуба Коласа. А між тым паэты яны вельмі па тыпе розныя. У ранняга Лужаніна — вялікае імкненне да інтэлектуальнай паэзіі, да эксперымента, згадаць яго верш «Тры оперы», у якім інтэрпрэтуецца ў трох варыянтах легенда пра Фаўста. Дарэчы, паэзія Якуба Коласа заўсёды была «празрыстай», народнай... Між тым пасля і паэзія Максіма Лужаніна таксама стала прастой і празрыстай...

*«Я разумеў Канстанціна Міхайлавіча, калі ён рабіў мне заўвагі, праўкі ў маіх рукапісах, разумеў, што яму магло быць не па сэрцу, і што трэба было сапраўды праправіць... Мы, канешне, былі розныя. У Коласа талент абсалютна самабытны, у мяне зусім не тое... Я значна больш, можа быць, кніжнік... Можа быць, чалавек, які больш падпарадкуецца нейкім уплывам... Менш просталінейны. Але духоўнае яднанне хоць сабе з чалавекам, з каторым адчуваецца аддаленасць нейкая, магчымае. Калі чалавек багаты вопытам, і багата надзелены Богам, то ад яго сілкуешся».*

## ПРА КНІГУ «РЭПАРТАЖ З РУБЦОМ НА СЭРЦЫ»

У 1968 годзе Максіма Лужаніна ўключылі ў дэлегацыю БССР для ўдзелу ў рабоце XXIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. У гэтым не было нічога дзіўнага — па традыцыі ў такія дэлегацыі заўсёды ўключалі пісьменнікаў, там пабывала нават юная Яўгенія Янішчыц. І адправіўся Аляксандр Каратай, колішні вязень «амерыканкі», у Амерыку... І трэба ж такому здарыцца, што на чужыне сэрца прыхапіла — інфаркт. Трапіў у бальніцу. Пра што і напісаў кнігу «Рэпартаж з рубцом на сэрцы». Мы не маглі не папытацца, колькі ў той кнізе шчырага — бо жыццё за акіянам апісваецца ў самых змрочных фарбах... Беларускіх дэлегатаў сапраўды вазілі па індзейскіх рэзервацыях, і яны назіралі, як тубыльцы гібеюць? Не, здаецца, не вазілі... Аляксандр Амвросьевіч намякнуў, што тое-сёе, можа, і перабольшана, бо «хацелася перш за ўсё пахваліць сваё». А вось пра жыццё ў савецкім дыпламатычным прадстаўніцтве Лужанін тое-сёе распавёў.

*«Калі я ляжаў там у бальніцы, сястра, што даглядала мяне, атрымлівала пяць долараў у гадзіну. А я, дэлегат, атрымліваў трынаццаць долараў на тыдзень. І трэба было на іх пражыць. Але мы былі людзі запаслівыя. Я прывёз беларускага сала некалькі брусоў. Мне сказалі паклапаціцца, каб у Амерыцы на гарэлку не траціцца. Узяў пляскатую флягу, і там змяшчалася больш за два літры спірту. Сказалі, курава дарагое... Узяў самых лепшых балгарскіх цыгарэт, якія ў нас тут былі... Затое, сказалі, на рэшту будзеш апранацца ў Амерыцы. Дарэчы, я і цяпер у амерыканскіх штанах хаджу — купіў матэрыял у Нью-Ёркскім квартале, дзе дзешавей, бо ёсць маленечкі брак. Дык што я дакупляў з прадуктаў? Я дакупляў яйкі, і была ў мяне яешня заўсёды з салам сваім. Цукар і чай купляў, хлеб там белы дрэнны такі, як вата... Таму ў нямецкім квартале рыжскі хлеб куплялі, але дарагі, маленечкая буханачка каштавала даляр. Хлеб мы елі напалавіну з крышанага зерня. Ездзілі з нашым кухарам на пірс, куплялі рыбу... Там дзешавей, калі бярэш з лодкі рыбу. Свае гэтыя чорныя дудачкі, штанцы, самі прасавалі, і кашулькі самі мылі — унізе была пральня. На долар я абедаў у сталовай — гэта быў біфштэкс, зеляніны гара... На прыёмы кожны дзень запрашалі. І калі ты трошкі завесіш вочы, то там можаш і напіцца, і наесціся. Я вельмі мала па Амерыцы пахадзіў, бо захварэў, толькі некалькі прывёз кніжак, што ў нас нельга было купіць — Гумілёва, яшчэ нешта... Раз толькі быў у кніжным магазіне. Было ў мяне запрашэнне выступіць у бібліятэцы Кангрэсу, але я ўжо не мог. Кухар з нашай сталоўкі такі быў спрытны дзяцюк, на рынку ўмела закупляцца... А потым паглядзелі мы на яго на параходзе — у мундзіры, з капітанскімі пагонамі, будзь здароў...»*

Запіс заканчваецца тым, што жанчына, якая апошнія гады даглядала Максіма Лужаніна, папрасіла зварочвацца, бо гаспадар хворы і дужа стаміўся.

З размовы той атрымаўся матэрыял для газеты «Літаратура і мастацтва»... Але, зразумела, увайшло туды не ўсё. Вось цяпер нешта яшчэ ўдалося аднавіць для гісторыі. Пакуль апошнія дыктафоны працаваць не перасталі.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Новыя кнігі

# ГІСТОРЫЮ ТАПОНІМАЎ АДКРЫВАЕ «РАДЗІМАЗНАЎСТВА»




**Чарговая кніжная навінка Выдавецкага дома «Звязда» — з кніг, якія належаць да ўдумлівага чытання. Доктар філалагічных навук, вядомы ў краіне мовазнаўца Васіль Шур прапаноўвае чытачу сваю новую працу — «Радзімазнаўства: з гісторыі беларускіх тапонімаў».**

Размова ў кнізе ідзе пра беларускія асабовых уласныя імёны, празвішчы, тапанімічныя назвы. Аўтар нагадвае, што «ў моўнай практыцы кожны з нас няўрэдка карыстаецца імі, што «такія адзінкі складаюць значную частку нашага слоўніка, частата іх ужывання досыць высокая».

Сапраўды, колькасць анамастычных назваў нават не паддаецца ўліку. Толькі афіцыйных назваў населеных пунктаў у краіне налічваецца каля 30 тысяч адзінак. А яшчэ ж — назвы вуліц, праспектаў, завулкаў, паркаў, стадыёнаў, назвы вадасховішчаў, рэк, азёр. За межамі паселішчаў — крыніцы, гаі, пушчы, палі, астравы, пералескі і інш. Вядома, што ў ваколіцах любой вёскі, хутара, зазначае аўтар, можна выявіць каля 100-150 урочышчаў, вадаёмаў, узвышшаў, участкаў лесу, асобных дрэў з імёнамі. Паходжанне назваў, імёнаў, вытокі, адкуль яны пайшлі, — усё гэта ў полі зроку даследчыка. Старонкі «Радзімазнаўства...», нягледзячы на навукова-публіцыстычны, а месцамі і навуковы стыль выкладання, чытаюцца літаральна на адным дыханні. Такую захапляльную кнігу здолеў стварыць вучоны, публіцыст, краязнаўца, які заклапочаны ў захаванні назваў, тапонімаў як часткі беларускай мовы, беларускай нацыянальнай культуры.

Нагадаем, што Васіль Васільевіч Шур, лёс якога праз многія дзесяцігоддзі звязаны з Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэтам імя І. П. Шамякіна, — аўтар кніг «З гісторыі ўласных імёнаў», «Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапаніміка і тапаніміка», «Анамастычная лексіка ў беларускай мастацкай літаратуры», «Онім у мастацкім тэксце», «Уласныя імёны ў часе і прасторы» "Уласнае імя ў мастацкім тэксце", «Уласнае імя ў соцыуме і мастацкім тэксце», «Беларускія ўласныя імёны: беларуская антрапаніміка і тапаніміка» і інш. Усяго пяру вучонага належыць болей за 330 навуковых і вучэбна-метадычных прац.

Кнігу Васіля Шура «Радзімазнаўства: з гісторыі беларускіх тапонімаў», якая пабачыла свет тыражом у 500 экзэмпляраў, можна набыць у кнігарнях ААТ «Белкніга» па ўсёй краіне, а таксама ў Мінску ў кнігарні «Акадэмічная кніга» па адрасе: праспект Незалежнасці, 72.

Прыемнага ўсім чытання! Новых адкрыццяў у вывучэнні роднай старонкі, адкрыцці вядомых і невядомых дагэтуль назваў, іх паходжання!

**Раман СЭРВАЧ.**

Сувязь пакаленняў

# ПРАЗ ГІСТОРЫЮ, ПАМЯЦЬ, АДЗІНСТВА

## Якія пытанні былі ўзняты на адкрыцці X Калядных чытанняў

**Кожны год напярэдадні вялікага свята Раства Хрыстова ў Беларусі праводзяцца адукацыйныя чытанні — шэраг мерапрыемстваў (круглых сталоў, канферэнцый, асветніцкіх сустрэч, выставак), прысвечаных выхаванню духоўных каштоўнасцяў і патрыятызму.**

Сёлета такія чытанні праводзяцца ўжо дзясяты раз. Урачыстае адкрыццё юбілейных Калядных чытанняў «80-годдзе Вялікай Перамогі: памяць і духоўны вопыт пакаленняў» адбылося ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Сустрэча была прымеркавана і да 25-годдзя Саюзнай дзяржавы.

Як заўважыў **Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін** перад пачаткам форуму, тэмы надзвычай актуальныя: «Калі азірацца назад, узгадваючы гісторыю, мы можам зрабіць важныя высновы для сучаснага чалавека і задумацца пра будучае. Важна асэнсаваць падзеі, якія адбыліся, даць каштоўнасныя ўстаноўкі сучаснаму чалавеку і абазначыць, як далей пераадольваць складанасці, чым моцны беларускі народ, што для яго значнае, чаму нельга адступаць ад сваіх традыцый і ў чым развіццё для нашага народа ў будучым».

Мітрапаліт падкрэсліў, што форум дае магчымасць яго ўдзельнікам не толькі паразважаць, але і вызначыць, што можна зрабіць, якая канкрэтная агульная справа можа аб'ядноўваць прадстаўнікоў розных сфер: інфармацыйнай, культурнай, адукацыйнай.

### ВАЖНЫЯ ЎРОКІ

Абраныя тэмы для абмеркавання — 80-годдзе Вялікай Перамогі і 25-годдзе Саюзнай дзяржавы — звязаны не толькі з супадзеннем юбілеяў у календары. «У аб'яднанні гэтых дат бачыцца вялікі сэнс. Для нашых народаў падзеі Вялікай Айчыннай вайны звязаны не толькі з жахлівымі выпрабаваннямі і нястачамі, яны сталі часам вялікага пад'ёму народнага духу і вялікіх подзвігаў. Не прыніжаючы ваеннага, палітыка-эканамічнага і асобаснага складальнікаў, бачыцца важным паглядзець у самую глыбіню гістарычных працэсаў, асэнсаваць духоўны бок тых падзей», — заўважыў мітрапаліт Веніямін і прапанаваў спыніцца на найбольш важных уроках, якія прапануе гісторыя. Яшчэ ў Евангеллі было напісана, што няма больш за тую любоў, як калі хто душу сваю пакладзе за сяброў сваіх. Гэтыя словы часта гучаць, калі ўзгадваюцца подзвігі герояў Вялікай Айчыннай, іх масавы гераізм. У гады цяжкіх выпрабаванняў народ праявіў свае найлепшыя якасці: стойкасць, гатоўнасць да самаахвярнасці, міласэрнасць да адоленага ворага, а менавіта такія якасці стагоддзямі і прывіваліся дзякуючы хрысціянскай веры. Гэтак фарміраваўся і адзінства народа. У наш час духоўнасць і высокія ідэалы таксама могуць і павінны аб'ядноўваць грамадства.

«Важна не толькі глыбока асэнсаваць урокі Вялікай Перамогі. Яны павінны стаць здабыткам усяго нашага грамадства і найперш — маладога пакалення», — падкрэсліў мітрапаліт. Рабіць жа гэта можна праз пашырэнне багатага станоўчага вопыту, які ўжо маецца, развіццё асветніцкай дзейнасці, праведзенне адукацыйных форумаў, напаўненне мерапрыемстваў новым і карысным зместам.





На пленарным пасяджэнні ў Нацыянальнай бібліятэцы сабраліся архіерэі і святары, прадстаўнікі дзяржаўных органаў улады, дзеячы культуры, вучоныя, кіраўнікі і выкладчыкі ўстаноў адукацыі, настаўнікі нядзельных школ, студэнты і іншыя.

Форум адбыўся пры падтрымцы Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі, Міністэрства інфармацыі, Нацыянальнай акадэміі навук, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

У рамках яго працавалі выстаўкі кніг выдавецтва Беларускага экзархату і паштовых мініяцюр Белпошты «Беларусь праваслаўная». Дабрачынны фонд падтрымкі сям'і, мацярынства і дзяцінства «Пакроў» прадставіў выставачны праект, які назаўёміў з яго сацыяльна-асветніцкай дзейнасцю.

Адным з прыкладаў такой работы можна назваць дакументальны фільм «Дзве Ефрасінні», якім адкрылася секцыйная праграма форуму. Стужка знята тэлеканалам «Спас» і прысвечана прынясенню ў верасні-кастрычніку каўчэга з мошчамі прападобнай Ефрасінні Полацкай у Епархіі Расіі, а каўчэга з мошчамі Ефрасінні Маскоўскай — у епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы. Амаль за два месяцы святым змаглі пакланіцца тысячы вернікаў. І гэтая акцыя і фільм, па ёй створаны, — дэманстрацыя духоўнага адзінства народаў.

У рамках міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» адбыўся паказ дакументальнай стужкі «За паству і Айчыну», які стаў працягам сумеснага праекта царквы з Беларускім тэлеграфным агенцтвам пад назвай «Воіны духу», прысвечанага подзвігу святароў і прыхаджан праваслаўнай царквы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Фільм прапанаваны для паказу на Міжнародных калядных чытаннях у Маскве. Яшчэ адзін патрыятычны праект — па захаванні памяці пра вязняў фашысцкіх канцлагераў — ініцыяваны Беларускім фондам міру і Міністэрствам юстыцыі. У крыпце Храма-помніка ў гонар Усіх Святых на захаванне памяці працуе музей, дзе сабраны сведчанні подзвігу нашага народа. Сюды прывозіцца зямля з палёў баёў, у якіх удзельнічалі выхадцы з тэрыторыі Беларусі.

### СТРАТЭГІЧНЫ РЭСУРС

«Актуальнасць чытанняў складана пераацаніць. Правядзенне іх у час 80-годдзя вызвалення Беларусі, напярэдадні 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне дасць магчымасць у перыяд глабальных выклікаў раскрыць важнейшыя тэмы для грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі. Сярод іх — праўда памяці і духоўны вопыт пакаленняў, абарона хрысціянскіх каштоўнасцяў і сэнсаў і іх роля ў выхаванні падрастаючага пакалення, моцная сям'я як важны стратэгічны рэсурс нацыянальнай бяспекі», — заўважыў **міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ** і выказаў гатоўнасць і надалей развіваць супрацоўніцтва з Праваслаўнай царквой па захаванні маральных і культурных традыцый беларускага народа, абароне гістарычнай праўды, выхаванні ў моладзі патрыятызму, любові да роднай зямлі, умацаванні веры ў дабрыню, міралюбства і справядлівасць як асновы духоўнага ўдасканалення сапраўднага грамадзяніна сваёй Айчыны.

На важнасць захавання агульнай гісторыі звярнуў увагу **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК**. Нельга забываць, што Перамога здабывалася дзякуючы адзінству народаў, і важна заўсёды помніць, што мы адказныя перад нашымі дзядамі і бацькамі за памяць аб іх гераізме: «Іх подзвіг і любоў да роднай зямлі працягвае служыць не аднаму пакаленню беларусаў і расіян прыкладам патрыятызму і павагі да людзей... Агульнадухоўная і культурная спадчына становіцца асновай для дыялогу і супрацоўніцтва. Пабуджае ўсіх нас, аб'яднаных агульным гістарычным мінулым, шукаць і знаходзіць шляхі да ўзаемадзеяння».

### ВЫХАВАННЕ ГРАМАДЗЯНІНА

**Намеснік міністра адукацыі Кацярына ПЯТРУЦКАЯ** упэўнена, што сумесная мэтанакіраваная работа розных устаноў садзейнічае выхаванню сапраўднага грамадзяніна і патрыёта на важных вехах гісторыі нашай краіны.

Кожнае новае пакаленне па-свойму асэнсоўвае старонкі ваеннай гісторыі. Педагогі дапамагаюць выхаванцам правільна зразумець важныя падзеі ваеннага ліхалецця, захаваць памяць пра вялікі подзвіг беларускага народа. «Прафесіяналізм, пошук наватарства дапамагаюць у дасягненні высакародных мэт у галіне выхавання моладзі», — раскрыла сакрэты работы ўстаноў адукацыі розных узроўняў Кацярына Пятруцкая. Яна звярнула ўвагу ўдзельнікаў форуму на тое, што выхаванне патрыёта з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў, які, акрамя ўсяго іншага, патрабуе асаблівых падыходаў: «Немагчыма фарміраваць патрыятызм аднымі тэарэтычнымі разважаннямі і расказамі пра гераічнае мінулае, неабходна актыўна ўключаць дзяцей і моладзь у практычную дзейнасць патрыятычнай накіраванасці».

Патрыятычныя і гераіка-ваенныя праекты ў нашай краіне атрымалі добрае развіццё і запатрабаванасць у падрастаючага пакалення. Дарэчы, многія з іх рэалізуюцца сумесна з Беларускай Праваслаўнай Царквой.

Тысячы педагогаў і навучэнцаў займаюцца пошукавай дзейнасцю. Дзякуючы іх карпатлівай рабоце нашчадкі герояў даведваюцца пра лёс сваіх блізкіх, няўручаныя ўзнагароды знаходзяць сваіх адрасатаў. У ходзе даследчыцкай дзейнасці навучэнцы адкрываюць новыя факты перыяду вайны, дапаўняюць старонкі ваеннай гісторыі сваёй малой радзімы. За ўстановамі адукацыі замацаваны помнікі і абеліскі. Сёння 2382 установы адукацыі пастаянна даглядаюць звыш сямі тысяч воінскіх пахаванняў. «Іх подзвіг у памяці нашчадкаў захаваем», «Маршрутамі памяці», «Маршрутамі адзінства», «Памяць пакаленняў у імя будучыні» — гэта далёка не ўсе падобныя праекты і праграмы ў сістэме адукацыі краіны.

Развіваюцца партнёрскія адносіны Праваслаўнай царквы і сістэмы адукацыі, вядзецца зацікаўлены канструктыўны дыялог, здзяйсняецца плённае супрацоўніцтва па пытаннях духоўна-маральнага і патрыятычнага выхавання.

«Школа ў шчыльным узаемадзеянні з сям'ёй, царквой павінна навучыць дзяцей адрозніваць дабро ад зла, дапамагчы раскрыць прыгажосць дабрыні, фарміраваць пачуццё адказнасці і бескарыслівай любові да людзей, радзімы», — заўважыла Кацярына Пятруцкая.

**Ганна ПЯТРОВА.**
**Фота Алены ДЗЯДЗЮЛІ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Мостовдрев», Гродненская область, Мостовский район, г. Мосты, ул. Советская, д. 38. УНП 500126145 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронных торгов**
Местонахождение: Гродненская область, г. Мосты, ул. Советская, д. 38

| Лот № | Наименование | Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Машина лесная погрузочно-транспортная МПТ-461.1**, зав. № 460, рег. знак ВВ-2 4788, 2009 г. в., инв. № 2670 | **22 050,00** |
| 2 | **Машина лесная погрузочно-транспортная МПТ-461.1,** зав. № 685, рег. знак ВК-2 3720, 2010 г. в., инв. № 5479 | **24 990,00** |
| 3 | **Трактор трелевочный Беларус-1221.2, «Беларус ТТР 411»**, зав. № 12031555, рег. знак СВ-4 3991, 2010 г. в., инв. № 995 | **23 582,00** |
| 4 | **Трактор трелевочный «Беларус ТТР-411»,** зав. № 12031184, рег. знак ВВ-2 0747, 2010 г. в., инв. № 4404 | **23 582,00** |
| 5 | **Трактор трелевочный Беларус-1221.2, «Беларус ТТР-411»,** зав. № 12031477, рег. знак СВ-4 3967, 2010 г. в., инв. № 996 | **23 582,00** |
| 6 | **Машина лесная погрузочно-транспортная МПТ-461.1**, зав. № 713, рег. знак ВК-2 5602, 2011 г. в., инв. № 2667 | **26 460,00** |

**Шаг аукциона: 5 % от текущей цены**

Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 10 календарных дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** 100 % оплата стоимости в течение **10 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также более подробную информацию о предмете торгов, о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов **затраты** на их проведение и оплатить **вознаграждение 6 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения торгов

Организатор электронных торгов, продавец имеют право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 11.01.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются** по **10.01.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **+375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35; E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ АКЦИОНЕРАМ
## ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис»

Настоящим информируем о поступлении 27.11.2024 от Общества с ограниченной отвественностью «БелГАЗавтосервис-НН» (местонахождение: 603024, Российская Федерация, Нижегородская обл., г. Нижний Новгород, ул. Дунаева, д. 17, помещение 4) **извещения о намерении продать принадлежащие ему простые (обыкновенные) акции ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» в количестве 1049360 (один миллион сорок девять тысяч триста шестьдесят) штук за 30935132,80 российских рублей (тридцать миллионов девятьсот тридцать пять тысяч сто тридцать два рубля восемьдесят копеек) с оплатой в российских рублях** путем зачисления денежных средств на расчетный счет продавца не позднее 90 (девяноста) дней, следующих за днем зачисления акций на счет «депо» покупателя.

Акционерам ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис», желающим воспользоваться своим преимущественным правом покупки продаваемых акций на вышеуказанных условиях, необходимо сообщить об этом ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» по адресу: 220014, г. Минск, пр-т Жукова, 44, каб. 502, а также ООО «БелГАЗавтосервис-НН» по адресу: 603065, Российская Федерация, Нижегородская обл., г. Нижний Новгород, ул. Переходникова, д. 6.

УНП 100123046

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 50 %

**Организатор аукциона:** ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1.

**Продавец:** ОАО «Калинковичский завод бытовой химии», г. Калинковичи, ул. Чехова, 17.

**Торги состоятся 17 декабря 2024 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28**

Подробный перечень имущества с ценами и задатками в количестве 2 лотов, порядок оформления участия в аукционе, документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Организатора торгов – **www.ocenkaservis.by в разделе Аукционы-«Очные торги».**

Дополнительное размещение на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 03.12.2024 по 13.12.2024 с 9.00 до 16.00**.

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 22.08.2024 г. № 163 (30297).

**Порядок ознакомления с имуществом по тел.: 8 (033) 616-72-16 Чернявский Эдуард Петрович.**

**Организатор торгов:**
**• 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 694-43-89.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

УНП 400023080

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПУСТУЮЩЕГО ЖИЛОГО ДОМА

**Организатор:**
Задорьевский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области

**Дата, время и место проведения аукциона: 3 января 2025 г. в 11.00**
по адресу: Логойский район, аг. Задорье, ул. Центральная, д. 5, Задорьевский сельисполком,
конт. тел.: (801774) 75 3 35, 75 3 83; (+37544) 7892553.
Эл. адрес: zadorye@logoysk.gov.by

| | |
|---|---|
| **Адрес пустующего жилого дома** | Минская обл., Логойский р-н, д. Засовье, ул. Шилянская, 4 |
| **Характеристика пустующего жилого дома** | Одноквартирный, одноэтажный жилой дом, бревенчатый, обложенный кирпичом, общая площадь: 77 кв. м, печное отопление, крыша – шифер. Зарегистрирован в РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» |
| **Земельный участок** | Земельный участок, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, не зарегистрирован |
| **Начальная цена** | 1 базовая величина |
| **Сумма задатка** | 20 % от начальной цены. Задаток перечисляется на расчетный счет р/с BY30AKBB3600619031 1010000000 в ОАО АСБ «Беларусбанк», код AKBBBY2X, УНП 600537220, код платежа 04805. Получатель – Задорьевский сельисполком |
| **Начало и окончание приема документов** | С даты объявления аукциона до 31 декабря 2024 года (включительно) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» и Положением о порядке продажи без проведения аукционов пустующих жилых домов, организации и проведения аукционов по их продаже, утвержденному постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.09.2021 № 547.

Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также юридические лица, если иное не установлено законодательными актами и международными договорами Республики Беларусь.

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. подать заявление об участии в аукционе по установленной форме;
2. предоставить квитанцию об оплате суммы задатка;
3. предоставить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;
4. заключить соглашение с местным исполнительным комитетом о правах, обязанностях и ответственности сторон.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с пустующим жилым домом на местности.

**Условия:** Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему пустующего дома в частную собственность с внесением платы за пустующий дом в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5%, обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся:

- внести плату за предмет аукциона и возместить затраты на организацию и проведение аукциона;
- подать заявление о предоставлении земельного участка;
- после принятия соответствующего решения – обратиться в Логойское бюро РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка и жилого дома.

